Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПЯТНІЦА
28 жніўня 1931 г.
№ 198 (3287)

ПАТРАБУЮЦЬ МІЛЬЕНЫ:

спыніць крывавую расправу катаў над рэвалюцыйнымі вязьнямі польскага фашызму

ПРЭЧ КРЫВАВЫЯ РУКІ!

Мазыр. 27-VIII. (БелТА). Фабрычны мітынг фабрыкі «Прафінтэрн» пратэстуе супроць нячуваных зьдзекаў польскага фашызму над тысячамі палітзьняволеных, лепшых працаўнікоў рэвалюцыйнага авангарду рабочае клясы і рэвалюцыйнага сялянства.

Рабочыя абяцаюць яшчэ з большай энэргіяй змагацца за выкананьне праграмы 3-га рашаючага, узмацніць абароназдольнасьць краіны і яшчэ шчыльней згрупавацца вакол кампартыі і яе ленінскага ЦК.

Сход рабочых пастанавіў адпрацаваць звыштэрмінова на карысьць палітзьняволеных 4 гадзіны.

Рабочыя заклікаюць гераічных барацьбітоў за польскі кастрычнік, яшчэ больш рашуча змагацца з крывавай дыктатурай польскага фашызму.

Прэч крывавыя рукі ад нашых зарубежных братоў!

Усе як адзін у рады МОПР'у!

Няхай жыве МОПР!

ПРЭЧ ТЭРОР!

ЖЛОБІН. 26-VIII. (Белта). У адказ на адозву ЦК МОПР'у Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да рабочых і сялянскіх мас усяго сьвету, агульны мітынг рабочых і служачых Жлобінскага комбінату выказвае сваю салідарнасьць з вядучымі гераічную барацьбу пад кіраўніцтвам кампартыі працоўнымі масамі Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Мы заяўляем катэгорычны пратэст супроць нячуванага разгулу фашысцкага тэрору ў Польшчы.

Востры сусьветны эканамічны крызіс выклікаў нячуваны ўздым рэвалюцыйнага руху. Польскі фашызм шукаючы выйсьця з цяперашняга становішча пачаў узмацнёны наступ на рабочую клясу і працоўныя масы і задушэньне рэвалюцыйнага руху.

10.000 палітзьняволеных церпяць нячуваныя зьдзекі і катаваньні. Ня гледзячы на стараньні фашысцкай жандармэрыі ўтаіць усё што адбываецца ў засьценках турмаў голас ахвяр фашысцкай дыктатуры праз турэмныя муры прарываецца да шырокіх мас рабочых і сялян.

Мы рабочыя і служачыя Жлобінскага камбінату ў адказ на белафашысцкі тэрор яшчэ больш узмоцнім тэмпы, каб выканаць плян пабудовы камбінату. Мы працягваем Вам брацкую руку дапамогі і зносім аднадзёны заработак (600 руб.) у фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным і абавязваемся ўзмацніць інтэрнацыянальную сувязь.

Усе як адзін у рады МОПР'у. Далоў белы тэрор, далоў фашысцкую дыктатуру Пілсудскага. Няхай жыве кампартыя Польшчы, Зах. Беларусі і Заходняй Украіны.

Досыць таптацца на месцы!

Чатыры месяцы, якія мінулі з моманту галошаньня адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб перабудове спажывецкай каапэрацыі,—зусім дастатковы тэрмін для таго, каб падагуліць прароблены, падвесьці вынікі пройдзенага шляху і намеціць чарговыя баявыя задачы.

Мы павінны канстатаваць, што, нягледзячы на перабудова спажывецкай каапэрацыі яшчэ далёка не завершана. Праўда, створаны аб'яднаньні Белкаапсаюзу і яго аўтаномных сэкцыі, часткова арганізавана гандлёвая сетка... Адсюль, увесь сэнс адозвы партыі і ўраду заключаецца-ж у тым, што арганізацыйная перабудова павінна прывесьці да палепшаньня якасьці работы сыстэмы. У патрабаваньні палепшыць якасьць абслугоўваньня спажыўца, падацца спажывецкую каапэрацыю тварам да задач сацыялістычнага будаўніцтва, тварам да прамфінпляну — зьезд адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР. І мы павінны з усёй рашучасьцю, з усёй сілай падкрэсьліць, што ў месьце работы спажывецкай каапэрацыі БССР мы ня бачым значных зрушэньняў. Якасьць работы спажывецкай каапэрацыі колькі-небудзь прыкметна ня змянята.

Па-ранейшаму гандлёвая сетка спажывецкай каапэрацыі працуе дрэнна, найбольш паказальным у гэтых адносінах зьяўляецца той факт, што ня ўдалося пакуль-што ліквідаваць чаргі. Ударны месячнік па ліквідацыі чаргі—жнівень месяц ужо канчаецца, але чаргі застаюцца вапіючым злом, вапіючым недахопам работы спажывецкай каапэрацыі. Мы не дамагліся такога колькі-небудзь прыкметных палепшаньняў у адносінах прадаўца да спажыўцоў. Павароту да спажыўца спажыўкаапэрацыя яшчэ далёка не зрабіла.

Гэта і арганізацыйная перабудова спажывецкай каапэрацыі хварэе буйнымі недахопамі. Мы маглі-б прадаваць гэта сьцьверджаньне такім, як прыкладу, фактам, як поўная ізацыя і адчужэньне ад Белкаапсаюзу і аўтаномнай сэкцыі Белкаапхарчу. Або такім фактам, што да гэтага часу праўленьні і ўпраўнаважаныя раду аўтаномных сэкцый яшчэ не абраны і яшчыкамі. Або, нарэшце, фактам затрымкі разрыву ў рабоце паасобных сэкцый. Так, напрыклад, да гэтага часу праўленьні Белкаапсаюзу пакідалі большую частку тавараў у сябе, ня ўлічваючы прапускной здольнасьці сваіх магазынаў, што няўхільна прыводзіла да затаварваньня, да замаражваньня таваразвароту і да стварэньня чаргі.

Аднак, найбольш паказальным зьяўляецца абсалютна недастатковыя, абсалютна недапушчальныя тэмпы разгортваньне сеткі новых крам і магазынаў. Нават МЦРК ледзь выканаў адну трэцюю частку праграмы разгортваньня сваёй гандлёвай сеткі. Да будаўніцтва новых магазынаў і каапэрацыйных рынкаў амаль ня прыступлена. А гэта-ж—цэнтральнае зьвяно барацьбы за перабудову, цэнтральнае зьвяно палепшаньня абслугоўваньня спажыўца. Трэба зразумець, што пашырэньнем гандлёвай сеткі і пераводам буйных магазынаў, сталовак і іншых прадпрыемстваў на гаспадарчы разьлік мы адкрываем вялікія магчымасьці для лепшага забясьпечаньня рабочых, для адшуканьня дадатковых крыніц забясьпечаньня і для пераходу ад сыстэмы разьмеркаваньня да сыстэмы гандлю.

Гаспадарчы разьлік у магазынах і сталовых—рашаючае зьвяно. Нажаль, мы маем такое становішча, што да пераводу каапэрацыйных прадпрыемстваў на гасразьлік па-сапраўднаму мала якія каапэрацыйныя арганізацыі прыступілі. У гэтай-жа сувязі трэба сказаць аб тым, што новая сыстэма заработнай платы не ажыцьцёўлена. Значыцца, у спажывецкай каапэрацыі па-ранейшаму панае абязьлічка ў кіраўніцтве прадпрыемствамі і ўраўнілаўка ў сыстэме заработнай платы—гэтыя самыя злыя ворагі перабудовы па-новаму работы спажывецкай каапэрацыі.

Парабудова спажыўкаапэрацыі далёка не завершана. Аб гэтым з выключнай сілай гаворыць зьмяшчаемы сёньня ў нашай газэце матарыял з «Спартака». Што можа быць красамоўней таго факту, калі Шклоўская спажыўкаапэрацыя, маючы ў сваіх руках буйную прыгарадную гаспадарку з 350 га гародніны, ня можа забясьпечыць бульбай сваю сталоўку? Што можа быць красамоўней такога факту, калі Шклоўская спажыўкаапэрацыя, маючы ў сваіх руках малочную фэрму з 250 каровамі, ня можа даць ні кроплі малака дзецям рабочых?

Шклоўская спажыўкаапэрацыя—сумны вопыт. Ён сьведчыць, з аднаго боку, тым, што кіраўніцтва яшчэ не ўладала новымі задачамі, не зразумела свайго месца ў барацьбе за прамфінпляц, не пачала працаваць па-новаму. Ён сьведчыць з другога боку, аб тым, што кіраўніцтва Белкаапсаюзу перабудовай усёй сыстэмы спажыўкаапэрацыі пакідае жадаць многа лепшага. Такі факт, калі на 5 месяцаў выпадае з пляну забясьпечаньня папяровая фабрыка «Спартак», фабрыка, ад работы якой залежыць ня ў малай ступені выкананьне пляну культурнай рэвалюцыі,—такі факт ці-ж ня сьведчыць аб тым, што сапраўднага паваротту да задач сацыялістычнага будаўніцтва спажывецкая каапэрацыя БССР яшчэ не зрабіла. Белкаапсаюз яшчэ не забясьпечыў сапраўднай пастаноўкі работы ўсёй-сваёй сыстэмы на службу прамфінпляну.

Нядаўна ЦК КП(б)Б і Менгарком КП(б)Б падагульвалі вынікі перабудовы спажывецкай каапэрацыі. Рашэньні па дакладах Белкаапсаюзу і МЦРК гаворыць аб нездавальняючых тэмпах перабудовы. А мінула-ж ужо чатыры месяцы!..

Мы ў праве патрабаваць ад усёй каапэрацыі і ад кожнага яе работніка: хопіць тупацца на месцы! Вышэй тэмпы перабудовы! Больш энэргічна і больш рашуча паварачвайцеся да спажыўца, да рабочых мас, да прамфінпляну!

Баявой задачай спажывецкай каапэрацыі трэба паставіць:

Дакладна, у тэрмін паказаны партыяй, цалкам ажыцьцявіць праграму разгортваньня гандлёвай сеткі;

безадкладна, на справе, перавесьці на гаспадарчы разьлік буйныя магазыны, сталоўкі і іншыя каапэрацыйныя прадпрыемствы, прадставіўшы ім правы самастойных загатовак і закупак, забясьпечыўшы ажыцьцяўленьне новай сыстэмы заработнай платы;

завяршыць у найкарацейшы тэрмін і ў пойнай меры арганізацыйную перабудову, забясьпечыўшы гнуткае апэрацыйнае кіраўніцтва аб'яднаньнямі і аўтаномнымі сэкцыямі з боку Белкаапсаюзу;

ліквідаваць чаргі, дамагчыся чыстага магазыну, дамагчыся добрых адносін паміж прадаўцом і спажыўцом.

Усе гэтыя задачы спажывецкая каапэрацыя можа і павінна выканаць у найкарацейшы тэрмін. Кожны работнік каапэрацыйнай сыстэмы БССР павінен зразумець, што больш адцяжак для перабудовы дадзена ня будзе. Перабудова павінна быць завершана. Адозва партыі і ўраду павінна быць выканана.

Далучаем свой голас да пратэсту мільёнаў

Заслухаўшы даклад тав. Фрыдмана аб разгуле фашысцкага тэрору ў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне агульны сход курсантаў настаўніцкіх палітэхнічных курсаў і падрыхтоўчых курсаў пры Магілёўскім Белпэдтэхнікуме, клеймяць ганьбай фашысцкіх апрычнікаў.

Агульны сход выказвае сваю салідарнасьць з вядучымі гераічную барацьбу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі працоўным масам Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны і з абурэньнем пратэстуе супроць зьверскіх катаваньняў фашысцкіх інквізітарамі палітзьняволеных.

Сьцісьнуты нябачаным эканамічным крызісам пад ударам магутнага росту рэвалюцыйнага руху ў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне, польскі фашызм шукае выйсьці ў новым наступе на рабочую клясу і працоўныя масы ў крывавым задушэньні рэвалюцыйнага руху і ў падрыхтоўцы імпэрыялістычнай вайны супроць Савецкага Саюзу.

Рашуча пратэстуючы супроць нячуваных зьверстваў польскай ахранкі мы яшчэ больш узмацнім тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны і інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас і вучняў у нашых школах.

Мы адлічаем 3 проц. ад нашага месячнага заработку у МОПР і абавязваемся на раённых канфэрэнцыях настаўнікаў узьняць пытаньне аб тым, каб сіламі настаўнікаў БССР пабудаваць дзіцячы дом для дзяцей палітзьняволеных.

Прэч тэрор, прэч катаў - забойцаў!

Патрабуем спыненьня крывавай расправы!

Жлобін, 25-VIII. (БелТА), Заслухаўшы інфармацыю т. Кудзелькі аб белым шалёным тэроры ў Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне аб нячуваных зьдзеках над палітзьняволенымі ў турмах, казэматах фашыцкай Польшчы, мы асьветнікі Жлобінскага раёну выносім свой пралетарскі пратэст і патрабуем спыненьня забойства і катаваньняў над лепшымі сынамі рабочых і рэволюцыйных сялян.

Каты-фашысты пілсудчыны, абшарнікі, капіталісты пэпэсаўцы, Астрэўскія і Луцкевічы—ланцужныя сабакі польскага фашызму—ня спыніць вам бурна ўзрастаючай хвалі рэволюцыйнай барацьбы рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны. Ня спыніць вам сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

Мы, асьветнікі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ажыцьцёвім пасьпяхова задачы 3-га рашаючага году пяцігодкі, дапаможам хутчэйшай ліквідацыі кулацтва, як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Таварышы рабочыя і рэвалюцыйныя сяляне Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны змагайцеся не шкадуючы сіл за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне і дыктатуру пралетарыяту ў сваіх краінах, трымайце моцна і высока сьцяг сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі і памятайце, што мы асьветнікі, як і ўсе працоўныя СССР,—з вамі і за вас аддамо ўсе сілы, сродкі і жыцьцё—за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ва ўсім сьвеце.

У адказ на шалёны фашыцкі тэрор мы, асьветнікі, уносім 300 руб. у дапамогу палітзьняволеным і абвяшчаем сябе ўдарнікамі па выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы.

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, мы закончым пабудову падмурку сацыялістычнай эканомікі СССР.

Няхай жыве непераможны рэвалюцыйны рух рабочых і сялян Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва СССР і яго кіраўнік—Усе КП(б).

Супроць зьніжэньня заработку і масавых звальненьняў

ВЕНА, 15-8. Паводле паведамленьня з Будапэшту, вэнгерская кампартыя і чырвоная прафапазіцыя разьвілі за апошні час вялікую дзейнасьць на мэталёпрамысловым заводзе Вэнгрыі ў Чэпэлі, арганізуючы барацьбу рабочых супроць зьніжэньня заработку і масавых звальненьняў.

Кампартыя гэтымі днямі выпусьціла лятучкі, заклікаючы рабочых застаецца на прадпрыемствах, ня лічачыся з праведзенымі звальненьнямі. Пад уціскам рабочых дырэкцыя фабрыкі была вымушана прыпыніць звальненьне. Падзеі ў Чэпэлі замоўчваюцца і сацыял-фашысцкім друкам.

ПАРЫЖ, 8-VIII. Абвешчаны лёкаут 6.000 рабочых у абуткавай прамысловасьці ў Ліможы, дзе з прычыны агульнага эканамічнага крызісу моцнае частковае беспрацоўе і вельмі нізкі заработак. Непасрэднай прычынай лёкауту паслужыла стачка салідарнасьці, выкліканая звальненьнем аднаго рабочага.

⊙ Акруговы суд прыгаварыў двух амэрыканскіх лётнікаў, прыбыўшых у Японію без дазволу японскай улады, пралицеўшых над умацаваньнямі зонамі і, зрабіўшых фатаграфічную здымку—да штрафу.

Сэкцыі—асноўнае зьвяно ў рабоце саветаў

Рашуча і неадкладна

перабудаваць масавую работу саветаў

Праз сэкцыі сельсаветаў мабілізаваць шырокія масы рабочых і калгасьнікаў на барацьбу за сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі

Рудзенскі с-савет павінен заразка перабудаваць сваю работу

Масавая работа ў Рудзенскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, зусім не разгорнута. Сэкцыі, якія існуюць пры сельсавеце, не праводзяць ніякай работы. У выніку гэтага ў рабоце сельсавету і калгасаў, якія існуюць на яго тэрыторыі, ёсьць шмат прарываў.

Сельсавет вельмі адстае ў калектывізацыі. Процант калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па сельсавеце складае каля 25. Масавага прыёму бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы па сельсавеце не наглядаецца.

У калгасах «Чырвоны спэцыяліст», «Чырвоная Зьмена» і «Савецкая Беларусь» яшчэ ня ўведзена зьдзельшчына і работа праводзіцца падзённа на прынцыпах кулацкай ураўнілаўкі. У калгасах «Бязбожнік» і «Вясёлае кыцьцё» зьдзельшчына уведзена, але толькі на паперы.

Вучот у гэтых калгасах не наладжаны. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты, сельскагаспадарчы інвэнтар не падрыхтаваны да асеньняй сяўбы. Пляну сяўбы яшчэ няма.

Сіласаваньне кармоў зрываецца. Ніводнай тоны сілосу ні ў адным калгасе яшчэ не закладзена. Пабудаваная яшчэ ў мінулым годзе ў калгасе «Савецкая Беларусь» сілосная вежа разваліцца.

Будаўніцтва малочна-жывёлагадоўчых фэрмаў сарвана на 50 проц. У калгасе «Бязбожнік» каровы стаяць у фразі. Плянавае кармленьне жывёлы не наладжана, дагляд дрэнны, у выніку гэтага ўдой кароў зьменшыўся.

Між тым, пры належнай пастаноўцы работы сельска-гаспадарчай вытворчай нарады пры сельсавеце, належным кантролі яе за работай калгасаў—гэтых недахопаў можна ў значнай меры было-б унікнуць.

Дрэнна абстаіць работа ў сельсавеце і з падрыхтоўкай да новага навучальнага году. Рамонт школ яшчэ не закончаны, школы не ў дастатковай меры забясьпечаны падручнікамі і абсталяваньнем.

Усеагульным навучаньнем па сельсавеце не ахоплены ўсе дзеці. Ліквідацыя няпісьменнасьці пастаўлена слаба. У сельсавеце ёсьць шмат калгасьнікаў і аднаасобнікаў няпісьменных. Савет культурнага будаўніцтва пры сельсавеце амаль зусім не працуе і ня цікавіцца вырашэньнем задач у галіне культурнага будаўніцтва.

Палажэньне аб сэкцыях пры сельсаветах у Рудзенскім сельсавеце яшчэ не распрацавана.

Рудзенскі сельсавет павінен заразжа па прыкладзе саветаў Ельчыны актыўна ўзяцца за перабудову масавай работы, практычна дабіўшыся таго, каб сэкцыі зрабіліся асноўнымі зьвеньнямі работы сельсавету.

Толькі пры гэтых умовах прарывы і недахопы ў рабоце сельсавету будуць ліквідаваны.

Брыгада «Сав. Бел.»:
Р. Сака і М. Вожык.

Сельскагаспадарчая вытворчая нарада Талачынскага местсавету ня цікавіцца работай калгасаў

Сэкцыя сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі пры Талачынскім местачковым савеце, Талачынскага раёну зусім не працуе. Ня гледзячы на тое, што ў паасобных калгасах, якія знаходзяцца на тэрыторыі местсавету ёсьць значныя прарывы ў рабоце, сэкцыя не клапоціцца аб тым, каб сваячасова ліквідаваць гэтыя прарывы.

Напрыклад, у калгасе «III Інтэрнацыянал» яшчэ ня скошаны вялікія плошчы сенажаці, амаль не распачата ўборка лёну, плян сіласаваньня па ўсіх калгасах местсавету стаіць перад рэальнай пагрозай зрыву, але сэкцыя сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі пры местсавеце, ды і ўвесь местсавет наогул, гэтае пытаньне, як відаць, зусім ня цікавіць.

Між тым галоўная прычына гэтых прарываў у рабоце калгасаў заключаецца ў тым, што праца ў калгасах яшчэ недастаткова арганізавана, рабочая сіла нерацыянальна расстаўлена. Большасьць калгасаў местсавету фактычна яшчэ не перайшлі на зьдзельшчыну.

Так, у калгасе «III Інтэрнацыянал» калгасьнікам нават не раздадзены разьліковыя кніжкі. Гэтыя кніжкі яшчэ не запоўнены і ляжаць у шафе старшыні калгасу. Дрэнна стаіць справа з увядзеньнем зьдзельшчыны ў калгасах «Камінтэрн», «Перамога» і інш.

У калгасе «Чырвоны Камунар» некаторыя калгасьнікі на чале з старшынёй калгасу выступаюць супроць сіласаваньня. Сам старшыня калгасу т. Журоўскі недаацэньвае гэтага пытаньня. Ён лічыць, што сіласаваць кармы калгасу непатрэбна, бо хопіць і сена.

Між тым калі-б сельска-гаспадарчая вытворчая нарада пры сельсавеце як належыць разгарнула сваю работу, бязумоўна, гэтыя прарывы і недахопы ў калгасах былі-б сваячасова папярэджаны.

Г. Трапер.

Апартуністычная практыка ў рабоце Капыльскага местачковага савету

Капыль, як цэнтр буйнага прымежнага раёну, мястэчка з асаблівым сацыяльным і нацыянальным пераплётам, патрабуе асабліва добрай пастаўкі работы местачковага савету. Аднак Капыльскі месцсавет далёка не адпавядае гэтым патрабаваньням.

З 45 членаў местсавету ў работу апошняга сяк-так уцягнута толькі трэцяя частка, рэшта членаў месцсавету зусім нічога ня робяць, а некаторыя нават перашкаджаюць месцсавету ў рабоце. Сэкцыі месцсавету зусім не працуюць, не працуе і група беднаты. У месцсавеце часта зьменьваюцца старшыні: за гэты год у месцсавеце працуе ўжо трэці старшыня.

Цяперашні старшыня месцсавету—вылучэнец, стары калгасьнік і актывіст, не атрымлівае кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце з боку РВК і мясцовай партарганізацыі.

У рабоце месцсавету паўнейшы правал па ўсіх галінах. Больш таго ёсьць факты скажэньня лініі партыі. Напрыклад, з даннай местсавету кантрольнай лічбы ў 16.000 руб. па рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага», сярод бядняцка-серадняцкіх мас амаль нічога не рэалізавана, а ўся сума разьвярстана ў форме «цьвёрдых заданьняў» кулацка-заможным гаспадаркам. Такія «цьвёрдыя заданьні» даваліся да 1000 руб., прычым гэтымі «заданьнямі» закранута і частка бядняцкіх гаспадарак.

Ёсьць прабелы і ў абкладаньні сельгаспадаркам. Характарна, што кіраўнікі савету ня ведалі, што ўжо прайшоў першы тэрмін здачы падатку і ня прыступілі да спагнаньня падатку.

Заданьне па сеназагатоўках па местсавеце выканана ўсяго на 40 проц.. Пытаньне аб хлебазагатоўках яшчэ не абгаворвалася местсаветам. Ніякай работы па падрыхтоўцы да асеньняй сяўбы местсавет не праводзіць.

Местсавет зусім ня цікавіцца работай калгасаў, якія знаходзяцца на яго тэрыторыі. Між тым у гэтых калгасах правалена сілосная кампанія, калгасы засьмечаны кулакамі і падкулачнікамі, у калгасах ня поўнасьцю абагулена маёмасьць і пасевы.

Усякага аднаасобніка, які зьвернецца ў местсавет па якіх-небудзь пытаньнях, местсавет пасылае ў калгас: «Ідзі ў калгас, ня будуць на цябе націскаць».

Беднота і серадняк аднаасобнікі аднаго вучастку ўжо больш двух тыдняў як ня могуць дапрасіцца ў местсавету аб тым, каб у іх вёсцы правялі сход па арганізацыі калгасу. У адказ на іх просьбы старшыня местсавету кажа: «—Я ня ведаю ўстаноўкі: калі нам патрэбны гіганты, дык чаго-ж мы будзем арганізоўваць новы дробны калгас—няхай паступаюць у існуючыя».

Камунальныя будынкі ў Капылі ператварыліся ў руіны. Каапэрацыя працуе вельмі дрэнна. Каапэратары дадумаліся нават да такой «клясавай» палітыкі забясьпячэньня і каапэраваньня, што саматужнікам забаранілі водпуск са сталоўкі абедаў і нават гарбаты.

Сярод чырвоных партызан не праводзіцца ніякай работы.

У мястэчку налічваецца каля сотні партыйцаў, ёсьць местачковая ячэйка КП(б)Б, але-ж яна ў рабоце местсавету ня прымае ніякага ўдзелу. РВК таксама нічым не дапамагае ў рабоце местачковага савету.

Такое становішча імкнецца скарыстаць кулак, нэпман і іншыя варожыя элемэнты вёскі і мястэчка ў сваёй дзейнасьці супроць ўсіх мерпрыемстваў партыі і ўраду.

Праеждж.

Бытавая сэкцыя Менскага гарсавету перабудавала сваю работу

Аднэй з лепшых сэкцый Менскага гарсавету зьяўляецца бытавая сэкцыя. Гэта сэкцыя здолела перабудаваць сваю работу, наблізіўшы яе непасрэдна да прадпрыемстваў і ўстаноў і згуртавала вакол сябе моцнае ядро актыву.

Апошні пленум сэкцыі, на якім разглядалася пытаньне аб рабоце 2-й дзіцячай сталоўкі МЦРК, адбыўся непасрэдна ў сталоўцы з удзелам абслугоўваючага пэрсаналу.

Пленум сэкцыі знайшоў у рабоце сталоўкі рад недахопаў і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы для іх ліквідацыі.

Пленум сэкцыі знайшоў неабходным прыняць меры да пашырэньня памяшканьня сталоўкі, лепшага забясьпячэньня яе абсталяваньнем, зрабіць вэнтыляцыю, дабіцца льготнага праезду на трамваі дзецям, якія харчуюцца ў сталоўцы. Апрача гэтага пленум рашыў адкрыць у рабочых раёнах гораду філіалы гэтай сталоўкі.

Бытавая сэкцыя ўзятыя на сябе аба вязкі па заключэньні сацдагавору з бытсэкцыямі Віцебскага і Гомельскага гарсаветаў ня толькі выконвае, але і перавыконвае.

За актыўную работу сэкцыі Прэзыдыум Менскага гарсавету прэміраваў бытавую сэкцыю 1.500 рублямі, якія будуць скарыстаны на пашырэньне ў Менску дзіцячых культурна-бытавых устаноў.

З. М.

Усім райкомам і гаркомам КП(б)Б

Культпроп ЦК КП(б)Б 1-га верасьня арганізуе ўсебеларускую радыё-пераклічку Райкомаў і Гаркомаў КП(б)Б па пытаньні разгортваньня партасьветы на новы навучальны год.

У пераклічцы будуць удзельнічаць: Гомельскі, Віцебскі, Магілёўскі, Полацкі, Менскі Койданаўскі і Добрускі ГК і РК КП(б)Б.

Радыё-пераклічка ставіць сваёй мэтай праверку выкананьня Райкомамі і Гаркомамі дырэктывы Сакратарыяту ЦК аб разгортваньні партвучобы на 1931-32 нав. год.

Радыё-пераклічка пачынаецца ў 9½ гадз. увечары. Аб парадку выступленьня ў пераклічцы і тэхніцы правядзеньня яе чакайце спэцыяльных паведамленьняў Белрадыёцэнтру.

Прыкладная схэма прамовы ГК і РК удзельнічаючых у радыё-пераклічцы па партасьвеце 1-IX—31 г.

У прамове неабходна ахапіць пытаньне рэалізацыі дырэктывы Сакратарыяту ЦК па партасьвеце на 1931-32 г. сурова ўлічваючы вынікі партвучобы за 1930-31 г. Неабходна асабліва асьвятліць наступныя пытаньні:

1. Як мабілізавана партарганізацыя па выкананьне дырэктывы Сакратарыяту ЦК КП(б) (абгаварэньне дырэктыў ЦК і вынікаў мінулагодняй вучобы на бюро РК і ГК, парткомах і ячэйках, па агульных партсходах, асабліва ў партгрупах, цэх'ячэйках, саўгасных і калгасных ячэйках) і практычных мерапрыемстваў партарганізацыі.

2. Арганізацыя масавых вечароў прысьвечаных партвучобе, скарыстаньне дружу, вылучаньне брыгад арганізатараў партасьветы, сацспаборніцтва, ударніцтва у падрыхтоўцы да навучальнага году.

3. Як захоўваецца вытворчы прынцып у пабудове сеткі партасьветы, бесьперапыннасьць навучальнага году, дабраахвотнасьць выбараў форм партвучобы.

4. Камплектаваньне сеткі: меркаваньне па ахопу сеткі партарганізацыі, асабліва кандыдацкага яе складу, камсамольскага і беспартыйнага рабоча-калгаснага актыву (ад 30 да 60 проц. б-п. з іх да 25 проц. жанчын).

5. Забясьпечанасьць сеткі партасьветы праграмамі, разьмеркаваньне іх па зьвеньнях, захады па падрыхтоўцы прапагандыстаў для сеткі. Мерапрыемствы па мэтадычным кіраўніцтве сеткі, партгабінэты, матарыяльнае забясьпячэньне іх.

6. Меркаваньне ГК і РК па вучобе партактыву (перасоўныя курсы партактыву, 10-20 дзённыя курсы актыву).

7. Мерапрыемства па ўкараненьні ў сетку партасьветы 4 пытаньняў вывучэньня тэхнікі. Мабілізацыя тэхнічных сіл у раёне для гэтай мэты.

8. Разгортваньне завочнай партвучобы па раёне, меркаваньні па ахопе і выкананьні разьвёрсткі ЦК па завочным навучаньні і матэрыяльная забясьпячэньне завочнага радыёнавучаньня.

Для прамовы дасецца 10 хвілін.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Масавыя арышты ў Варшаве

Колькасьць арыштаваных настолькі вяліка, што стварае ўражаньне паліцэйскіх пагромаў у рабочых кварталах

ВАРШАВА, 26-VIII. Фашысцкі друк Польшчы пералоўнены паведамленьнямі аб масавых вобысках і арыштах, западазроных у камуністычнай дзейнасьці, у рабочых кварталах Варшавы.

Гэта чарговая кампанія арыштаў знаходзіцца ў сувязі з масавымі дэманстрацыямі рабочых Варшавы да турмаў, якія адбываюцца штодня пад лёзунгамі — «прэч крывавы турэмны рэжым», «прэч тэрор, прэч катаў-забойцаў». Масавымі вобыскамі і арыштамі западазроных у прыналежнасьці да кампартыі, МОПР'у, польская ахранка імкнецца запугаць працоўных—спыніць дэманстрацыі пратэсту пралетараў Варшавы, супроць крывавай расправы над палітзьняволенымі.

Колькасьць арыштаваных натолькі вяліка, што стварае ўражаньне паліцэйскіх пагромаў у рабочых кварталах. За адну ноч з 24 на 25 жніўня было арыштавана 130 чалавек. З 25 па 26 згодна паведамленьню фашысцкага друку, колькасьць арыштаваных перавышае 200 асоб.

Урад выратаваньня фунта стэрлінгаў

ЛЁНДАН, 24-VIII. Апублікавана афіцыйнае паведамленьне, у якім гаворыцца, што «новы ўрад будзе не каліцыйным урадам у звычайным разуменьні, а ўрадам супрацоўніцтва для адзінай мэты—вырашыць стварыўшаяся надзвычайнае становішча.

Паведамленьне дадае, што, як мяркуецца, парлямант будзе скліканы 8 верасьня. У парлямант будуць унесены прапановы, прадугледжваючыя вельмі вялікае скарочаньне выдаткаў.

«Новы ўрад,—зазначае паведамленьне,—прыме ўсе захады, якія ён палічыць патрэбным, каб захаваць непахісным давер'е да фунту стэрлінгаў, на якім аснованы добрабыт брытанскай нацыі і большай часткі цывілізаванага сьвету».

ЛЁНДАН, 25-VIII. Новы ўрад сфармаваны. Прам'ер—Макданальд (лейбарыст), Лорд—старшыня савету—Балдунін (кансэрватар), міністр фінансаў—Сноўдэн (лейбарыст), міністр унутраных спраў—Сэмюэль (лібэрал, у першы раз быў членам ураду ў 1909 годзе; з 1909 па 1917 г. быў пасьлядоўна: міністрам пошты і тэлеграфу, міністрам гандлю і міністрам унутраных спраў. З 1920 па 1925 год—вярхоўным камісарам Палестыны. У часе стачкі гарнякоў у 1925 г. Сэмюэль быў прызначаны старшынёй вугальнай камісіі). Лёрд-канцлер — Сэнкі (лейбарыст, вядомы юрыст, старшыня камісіі канфэрэнцыі «круглага стала» па выпрацоўцы канстытуцыі для Індыі). Міністр замежных спраў — Рэвінг (лібэрал). Міністр па справах Індыі—Хор (кансэрватар, у часе сусьветнай вайны кіраваў у Петраградзе бюро ваеннай інфармацыі. У габінэтах Бакінгар, Лоў і Балдуіна быў міністрам авіяцыі). Міністр па справах дамініёнаў і калёній—Томас (лейбарыст). Міністр аховы здароўя—Нэвіль Чэмбэрлен (кансэрватар, брат былога міністра замежных спраў. Осьціна Чэмбэрлена. У габінэце Балдуіна займаў гэтую-ж пасаду. У сучасны момант старшыня кансэрватыўнай партыі, буйны прамысловец). Міністр гандлю—Кенліф-Лістэр (кансэрватар).

ЛЁНДАН, 25-VIII. Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, Балдуін зрабіў наступную заяву: «крызіс настолькі сур'ёзны, што абавязкам кожнага зьяўляецца хоць-бы часова адставіць у бок партыйныя разгалосьці і супрацоўнічаць у інтарэсах нацыі. Стварэньне нацыянальнага ўраду прадстаўляе з сябе гарантыю таго, што сур'ёзнасьць становішча ўсьвядомлена і што ўрад цьвёрда парашыў безадкладна прыняць меры, каб прывесьці фінансы краіны ў парадак.

Крызіс патрабуе безадкладных мер, і роспуск парламанту пры сучасных абставінах з надыходзячымі ўсеагульнымі выбарамі быў-бы катастрофай.

Няма гутаркі аб якой-небудзь сталай кааліцыі. Пасьля выкананьня ўрадам сваёй задачы, парлямант будзе, мабыць, распушчаны, як толькі гэта дазволяць абставіны, і кожная партыя зможа прадставіць на ўхвалу сваіх абіральнікаў сваю палітыку».

ЛЁНДАН, 25-VIII. Гендэрсон робіць розныя натугі, каб выратаваць лейбарыстскую партыю ад развалу. «Дэйлі Геральд» сёньня абвяшчае, што Макданальд, Сноўдэн і іншыя міністры, увайшоўшыя ў нацыянальны ўрад, дзейнічаюць ад свайго ўласнага імя, без санкцыі партыі.

На першым паседжаньні лейбарыстскай фракцыі ў парлямансе 8 верасьня Макданальд зьніме абавязкі лідэра, і абавязкі лідэра лейбарыстскай фракцыі пройдуць да Гендэрсона.

Заўтра Гендэрсон склікае аб'яднанае паседжаньне нацыянальнага камітэту лейбарыстскай партыі, Генсавету, прафсаюзаў і камітэту парляманцкай фракцыі, на якім гэтыя арганізацыі фармальна адмяжуюцца ад палітыкі нацыянальнага ўраду.

ЛЁНДАН. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «Маркіз Кру (лібэрал, былы пасол у Парыжы) назначаны ваенным міністрам».

ЛЁНДАН, 25-VIII. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «паводле вестак з аўтары тэтных крыніц, на паседжаньні габінэту была поўная згода ў адносінах праблем, якія

Засталося 9 дзён да сканчэньня лёнаўборачнай

Убіраць ня менш 7.000 га ў дзень

6 чалавек з брыгады Майсеевай ўбіраюць адзін га лёну ў дзень. Тэмпамі перадавых працаваць ва ўсіх калгасах і саўгасах

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ на Гарадокшчыне

Гарадокшчына здае тэмпы лёнаўборкі

ГАРАДОК, 22-VIII. (Ад нашага спэцкора). Гарадоцкі раён як паўночны раён павінен закончыць лёнацерабленьне да 1-га верасьня. На 20-е жніўня па Гарадоцкім раёне выцерабленa 6588 га, або 49,4 проц. пляну. Наперадзе ідуць калгасы, адстаюць аднаасобнікі (51,12 проц.—калгасы і 47,63 проц. аднасобны сэктар). Каля 20 проц. выцерабленага лёну ўжо абмалочана, 8 проц. паслана і 9 проц. замочана.

Ня гледзячы на значныя посьпехі ва ўборцы лёну ў паасобных сельсаветах і калгасах, тэмпы ўборкі лёну ў раёне ў асноўным яўна нездавальняючыя. Паасобныя кіраўнікі раённых устаноў, разважаючы над сучаснымі тэмпамі лёнаўборкі, супакойваюць сябе тым, што нібы гэта павольнасьць тэмпаў ва ўборцы тлумачыцца значнай плошчай засеву лёну па раёне, недахопам рабочых рук. 14500 га плошчы засеву лёну ў раёне ні ў якім разе ня можа служыць «аб'ектыўнаю» прычынаю. Тэмпы лёнацерабленьня Гарадокшчына можа і павінна ўзяць бальшавіцкія.

49,4 проц.—гэта паказьнік, які патрабуе неадкладнага пераключэньня на арганізацыю вытворчых сіл раёну. Недавыкананьне раёнам пляну лёнацерабленьня першых двух пяцідзёнак зьяўляецца прычынай надзвычайнага адставаньня раду сельсаветаў і калгасаў. Гэта адставаньне абумоўлена дрэнным апэрацыйным кіраўніцтвам лёнаўборкай і апартуністычнай недацэнкай арганізацыі працы і вучоту—ігнараваньнем зьдзельшчыны ў калгасах.

Замест апэрацыйнага кіраўніцтва Райза і Райкалгассаюз па ранейшаму адно і робяць, што штампуюць зводкі. Вытворчая калгасная ўзаемадапамога ў раёне не разгорнута. Больш таго ні Райза, ні Райкалгассаюз не падхапілі ініцыятыву вызнай газэты «Савецкая Беларусь на Гарадокшчыне» аб арганізацыі ільняной вытворчай перакліччі аднаасобнікаў з калгасьнікамі.

У той час, як рад сельсаветаў са значнай плошчай засеву лёну наближаюцца да 70—80 проц. выкананьня пляну лёнацерабленьня, ёсьць сельсаветы з малай плошчай засеву лёну, якія застаюцца пры 30—40 проц. выкананьня пляну ўборкі лёну.

Зьдзельшчына праверана на практыцы, асабліва на лёнацерабленьні. Там, дзе увядзена зьдзельшчына, незалежна ад плошчы засеву уборка ідзе з вялікімі посьпехамі. Там, дзе адсутнічае зьдзельшчына,—уборка пад пагрозай зрыву.

Ня гледзячы на гэта практычным мерапрыемствам па ўвядзеньні зьдзельшчыны зямельнымі і калгасна-каапэрацыйнымі органамі раёну не надаецца ўвагі. Зьдзельшчыну на Гарадокшчыне ня толькі ігнаруюць, тут маюць месца яшчэ і на сёньняшні дзень адкрытыя апартуністычныя выступленьні супроць зьдзельшчыны з боку паасобных членаў партыі і камсамольцаў—кіраўнікоў калгасаў. Так 21-га жніўня на пленуме Кабішчанскага сельсавету выступіў старшыня калгасу «Шлях Сацыялізму» камсамолец Анушко, які даказваў, што ў іх калгасе нельга прымяніць зьдзельшчыну. Ня дзіва, што гэты калгас разьядае кулацкая ўраўнілаўка, адсутнічае працадысцыпліна; за увесь час уборкі выцераблена усяго 1,5 га лёну. Прадукты-ж і прамтавары разьмяркоўваюцца падушна.

К-ч.

Скончылі ўборку лёну

Калгас «Вольная Праца» (Смалявіцкі раён, Забалоцкі сельсавет) абагуліў усе пасевы і датэрмінова скончыў уборку тэхнічных культур.

Усе ўборачныя работы былі праведзены на зьдзельшчыну.

Пры ўборцы лёну жанчыны-ударніцы выпрацоўвалі па паўтары нормы і больш. Па лёну выцярэблівалі за дзесяць працадзён. Па сельсавеце ўборка ў сацыялістычным сэктары амаль ужо скончана, застаўся толькі зялёны лён. Зараз пачалася асеньняя сяўба.

Цымбарэвіч М.



Брыгада Лапуцька па ўборцы ільну. (Калгас «Уперад» Смалявіцкага р.).

Пусьціць у ход лёнацерабілкі

Дуброўна. (Наш. спэцкор.). У Расткоўскім сельсавеце з прычыны паломкі не працуе лёнацерабілка. Таксама не працуюць 2 лёнацерабілкі ў калгасе «Прамень кастрычніка».

Ні праўленьне калгасу, ні Дубровенская МТС ня прымаюць ніякіх захадаў, каб паправіць лёнацерабілкі і арганізаваць мэханізаваную ўборку лёну.

Такія адносіны да справы нельга інакш кваліфікаваць, як правым апартунізмам на практыцы.

Таксама ганебна абстаіць справа з выкарыстаньнем трактароў. Ад дырэктара Дубровенскай МТС можна пачуць такія разважаньні: «Не хапае трактарыстаў». «Калгасы самі адмаўляюцца ад трактароў» і г. д. Трактары цалкам не скарыстоўваюцца. Большая частка працуе ў адну, нават ня поўную, зьмену, а то і зусім стаяць.

Трэба пакласьці канец гэтым непаладкам. Трэба ўсю наяўнасьць лёнацерабілак і трактароў пусьціць у ход, трэба забясьпечыць своячасовае выкананьне лёнаўборачнай і асеньняй сяўбы.

Макарэвіч.

Пасіліць тэмпы лёнаўборачнай і сяўбы азіміны

Паводле вестак НКЗ, на 25-га жніўня па БССР убрана 165.594 га лёну, што складае 69,2 проц., плян уборкі іншых яравых выкананы на 56,3 проц. Вельмі марудна разгортваецца сяўба азіміны. Ня гледзячы на тое, што апошні тэрмін сяўбы азімых вызначан 10 верасьня, да гэтага часу плян выкананы на 2,1 проц. Толькі нязначная колькасьць раёнаў уключылася ў сяўбу. Па паўночных раёнах плян сяўбы азіміны выкананы на 7,7 проц. на цэнтральных—0,5 проц., па паўдзённых 0,8 проц.

Пабудова Бабруйскага лёназаводу—пад пагрозай зрыву

Бабруйск, 6-VIII. (Белта). На пабудове Бабруйскага лёназаводу адсутнічае належнае кіраўніцтва з боку адміністрацыі. Раённыя арганізацыі не паставілі ў асяродак увагі будаўніцтва лёназаводу і не мабілізавалі грамадзкасьць вакол гэтага пытаньня.

Будаўніцтва заводу выканана ўсяго на 10 проц.

Не 12, а 6 жанчын на 1 га

вось сустрэчная норма брыгады Майсеевай

Гарадок 22-VIII (ад нашага ўласнага к-та). Калгас «Чырвоны Перакоп» Пальмінскага сельсавету мае 102 га плошчы засеву лёну. На ўборцы лёну працуе 5 жаночых брыгад у ліку 32 жанчын. На сеньняшні дзень, ня гледзючы на малы лік працоўных адзінак, выцераблена 60 га.

У чым сакрэт посьпехаў уборкі перакопцаў? Гэты сакрэт заключаецца ў правільнай арганізацыі працы і вучоту—у зьдзельшчыне. У раёне ўстаноўлена сярэдняя норма выпрацоўкі на 1 га 12 жанчын. У тых калгасах, дзе адсутнічае зьдзельшчына, гэту норму выконваюць з вялікай нацяжкай, або зусім ня выконваюць.

У калгасе «Чырвоны Перакоп» вызначаную норму ня толькі перавыконваюць, але ўдарныя брыгады даюць ня бачныя паказьнікі сустрэчных норм выпрацоўкі. У перакопцаў лічаць, што калі 1 га выцярэбліваюць 10 жанчын—гэта адстаючыя тэмпы, 8 жанчын на 1 га сярэдняя ударнасьць, 7 жанчын—падвойна ўдарныя тэмпы, і, пад канец самая рэкордная норма выпрацоўкі—6 жанчын на 1 га. У перакопцаў ёсьць такая ўдарная брыгада, якая павялічыла норму выпрацоўкі ў 2 разы, гэта брыгада Майсеевай Алесі. 8-га жніўня 6 жанчын брыгады Майсеевай выцерабілі 1 га за дзень.

Да рэчы, камсамольская ячэйка калгасу мае права ганарыцца практычным ажыцьцяўленьнем паходу камсамолу за 2000 га лёну: у ліку 6 брыгады Майсеевай—4 камсамолкі. Брыгада Майсеевай за ўдарныя паказьнікі на фронце лёнацерабленьня атрымала прэмію. Гэта-ж брыгада ўжо мае адну прэмію за ўдарнае правядзеньне веснавой сяўбы.

Ёсьць у перакопцаў героі працы і не камсамольская ўзросту; Эндэрсон Адэля, былая батрачка, ня гледзячы на 60 гадовы узрост папрасіла ў праўленцаў каб яе таксама ўключылі ва ўдарны дэкаднік штурму ільнянога пёракопу.

«Застаўце мне вось тут каля хаты гектар, або два—папрасіла старая—я памаленьку, ды таксама дапамагу...».

І гэтае «памаленьку» ператвараецца ў тое, што старая за 7-8 дзен выцярэбліває 1 га.

Тэмпы перакопцаў—барацьбітоў на фронце лёнаўборкі, павінны ведаць усё калгасы і ў першую чаргу адстаючыя.

Якуб Паляшук.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 198 (3287)

Мсьціслаўскі і Магілеўскі раёны

зрываюць раньнюю сяўбу азімых

Плян асеньняй сяўбы па БССР выкананы толькі на 2,1 проц.

Мсьціслаўшчына зрывае тэрміны асеньняй сяўбы

Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы ў Мсьціслаўскім раёне праходзіць вельмі марудныя тэмпамі. Да сёньняшняга дню значная частка калгасаў яшчэ не пачынала ворыва папару пад жыта, не пачынала зяблева. Многа калгасаў будуць пачынаць асеньнюю сяўбу без плянаў. Глеба пад жыта дрэнна выраблена і слаба ўгноєна. На станцыі Хадосы мокне пад дажджем вялікая коль касьць штучнага ўгнаеньня. Раённыя арганізацыі ведаюць пра тэта, але яны да гэтага часу не прынялі мер каб калгасы выкупілі ўгнаеньне і свая часова ўнесьлі яго пад азіміну. У некаторых калгасах яшчэ не памалочана і не адсартавана пад асеньні пасеў на сеньне. Напрыклад калгасы Татаршчынскага сельсавету імя «Правды», 1-га мая» і інш. зусім ня рыхтуюцца да сяўбы.

Райкалгассаюз ня мае жывой сувязі з калгасамі. Ён больш за ўсё карыстаецца папяровымі загадамі.

Такому ганебнаму адставаньню ў асеньняй сяўбе трэба пакласьці канец. Раённыя арганізацыі павінны ўзварушыцца і прыняць рашучыя меры каб натнаць прапушчаныя тэрміны ў асеньняй сяўбе. Мсьціслаўшчына не павінна адстаць ад іншых раёнаў.

М. С. Піскун.

Чырвонаармейцы на дапамогу уборачнай.

Адсутнасьць зьдзельшчыны і вучоту працы прыводзіць калгас да развалу

Згодна пляну ўсе калгасы Талачынскага раёну павінны былі пачаць асеньнюю сяўбу 15 жніўня. Але для калгасу «Чырвонае поле», Старасельскага сельсавету гэты тэрмін неабавязковы. Калгас зусім не падрыхтаваўся да асеньняй сяўбы. На 20 жніўня яшчэ ня было падрыхтавана ніводнага кілёграму насеньня. Жыта ў калгасе не абагулена і не абмалочана. Зусім не падрыхтавана плошча пад пасеў. Ня складзены пасеўны плян, не падрыхтаваны інвэнтар. У калгасе ня ўведзена зьдзельшчына. Дрэнна паставлен вучот працы. Рабочая сіла не разьбіта на брыгады. Замест падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы, праўленьне калгасу на чале з старшынёй займаецца п'янкамі.

Сярод калгасьнікаў зусім адсутнічае прапоўная дысцыпліна. З прычыны неналаджанасьці вучоту працы ні адзін калгасьнік ня ведае колькі ён выправаў працадзён. Калгас ідзе да развалу. Трэба прыняць тэрміновыя і рашучыя меры, каб папярэдзіць гэты развал.

Росман.

Магілеўшчына марудзіць з асеньняй сяўбою

Магілёў, 23-VIII. (Белта). Падрыхтоўка да асеньняй сяўбы па раёне прахо дзіць ганебна марудными тэмпамі. Ссыпка насенных фондаў і ачыстка насеньня выкананы ўсяго на 40 проц. У калгасах зусім адсутнічае зьдзельшчына, рабочая сіла расстаўлена няправільна, інвэнтар не падрыхтаваны. З 13 складаных малатарань і 65 простых, якія маюцца, большасьць не адрамантаваны, з гэтай прычыны малацьба праходзіць вельмі марудна. Райза, райкалгассаюз, праўленьні к гасаў і сельсаветаў недаацэньваюць л ні асеньняй сяўбы. Замест жывой с вязі, апэрацыйнага кіраўніцтва пан канцалярская пісаніна. Ніводная раённых арганізацый ня ведае кол інвэнтара адрамантавана. Амаль адзін калгас не пачынаў падрыхтоў азімага кліну. Асеньняя сяўба ў Ма лёўскім раёне знаходзіцца пад пагр зай зрыву.

Напярэдадні навучальнага году

ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ШКОЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА—

умова пасьпяховага ажыцьцяўленьня ўсеагульнага навучаньня

Аршанскі, Крупскі і Талачынскі раёны школьнае будаўніцтва прадаставілі самацёку

Арганізацыі Дубровенскага раёну! Што вамі робіцца, каб быць зьнятымі з чорнай дошкі?

ЗВОДКА

аб ходзе падрыхтоўкі да новага навучальнага году

ШКОЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА І КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ

на 20-га жніўня

РАЁНЫ	Школьнае будаўніцтва			Капітальны рамонт школ		
	Павінна было пабудаваць школ	Скончана пабудовай	Не распачата пабудовай	Патрабуюць рамонту	Скончан рамонт	Не распачаты рамонт
1. Бабруйскі	12	2	2	12	3	7
2. Бешанковіцкі	5	2	—	3	1	—
3. Брагінскі	7	2	2	4	2	—
4. Була-Кашалеўскі	5	1	1	8	3	—
5. Бялыніцкі	10	2	—	4	2	—
6. Веткаўскі	10	—	—	14	—	—
7. Гарадоцкі	8	2	1	19	9	10
8. Глускі	9	2	2	9	2	5
9. Дубровенскі	8	—	—	9	2	1
10. Кармянскі	6	1	2	6	—	2
11. Клічаўскі	8	—	2	3	1	1
12. Койданаўскі	16	2	—	13	—	—
13. Чырвонапольскі	7	—	—	15	4	11
14. Лоеўскі	5	1	—	20	11	3
15. Нараўлянскі	8	3	1	3	—	—
16 Пухавіцкі	4	—	—	27	9	2
17. Старобінскі	13	1	1	12	2	10
18. Сураскі	5	1	1	11	8	1
19. Уваравінкі	8	—	2	11	2	—
20. Чашніцкі	2	—	—	9	1	3
У %%	100,0	14,1	10,9	100,0	28,6	25,8

Школьнае будаўніцтва пад пагрозай зрыву

Да пачатку новага навучальнага году засталося 5 дзён. Зараз ужо павінна быць скончана падрыхтоўчая работа, павінна быць скончана пабудова новых школ і рамонт старых, павінны быць набыты падручнікі і наогул усе неабходнае да пачатку заняткаў у школах.

Што-ж мы маем зараз, напярэдадні новага навучальнага году, у справе будаўніцтва новых школ?

Па Аршанскім раёне ў гэтым годзе будуецца 12 новых пачатковых двухкамплектных школ і адна сямігодка. Пабудова 4-х школ пачата яшчэ ў мінулым годзе, а дагэтуль ніводная школа ня скончана. Чатыры школы Аршанская будкантора перадала Аршанскаму райвыканкаму ня скончанымі. У хуткім часе яна мяркуе тое-ж самае зрабіць і з астатнімі школамі.

Справа ў тым, што школьнае будаўніцтва па Аршанскім раёне не забясьпечана будаўнічымі матар'яламі, што і прымусіла кантору зусім спыніць будаўніцтва. Другая прычына—цякучасьць рабочай сілы, недахоп яе. Толькі зараз Аршанскі райвыканком схамянуўся і пачынае хадайнічаць перад СНК БССР ад водпуску будаўнічых матар'ялаў для сканчэньня пабудовы школ.

У Талочыне ня лепш, чым у Воршы

Яшчэ месяц таму назад зусім спыне на пабудова школ у в. в. Сурнаўка, Аналіна, Валосава і Філатава. Пр чына—адсутнасьць будаўнічых мата ялаў. Астатнія школы таксама пер дадзены Талачынскаму райвыканко няскончанымі. Спынена і пабудо сямігодкі ў Талачыне, з прычыны н дастаўкі райвыканкомам будаўнічы матар'ялаў.

Такім чынам, у Талачынскім раё да пачатку новага навучальнага го ня будзе скончана ніводная нов школы.

У Крупскім раёне перабу дова школ амаль спынен

Пабудова чатырохкамплектнай ш лы ў м. Крупках (пад бокам у РВ пачатая яшчэ летась да гэтага ча яшчэ ня скончана. Будаўнічыя матар ялы дастаўляюцца неакуратна і працягу ўсяго лета часткамі.

Амаль у такім-жа становішчы буд ніцтва школ у п. в. Дзянісавічы, Сак ловічы і Слабада. На пабудове ўс школ не хапае самых патрэбных м тар'ялаў:—цэглы, цьвікоў, рэек, го таў, ня гледзячы на тое, што яны п вінны былі быць дастаўлены райв канкомам на пабудовы яшчэ да 1- мая г. г.

Спыняецца зусім работа па пабудо школы ў в. Варашылы, Сеньненска раёну, з прычыны недахопу ванны, манту, шкла, цьвікоў і г. д. Па ты жа прычынах спыняецца пабудо школы ў в. Вакары, Багушэўскага се савету, (былога Багушэўскага раёну Спынена пабудова Анікаўскай шк лы, (Маслакоўскі сельсавет, былы, К пыльскі раён).

Вось якое становішча са школьны будаўніцтвам у Аршанскім, Талачы скім і Крупскіх раёнах. Пагроза зрыв пабудовы новых школ зьяўляецца т сама пагрозай і новаму навучальнам году.

Мясцовыя арганізацыі павінны пр няць усе меры, каб выканаць пл школьнага будаўніцтва.

А. Сёмін.

ЛІКВІДАВАЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ, УВЕСЬЦІ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ,

перавыканаць плян сіласаваньня абавязаўся саўгас „Натальеўск"

Шклоўскі раён яшчэ ня ўзяўся за рэалізацыю адозвы ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі

Натальеўцы абавязуюцца

Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал жывёлагадоўчага саўгасу «Натальеўск» Чэрвенскага раёну, абмеркаваўшы адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, абвясьцілі сябе мабілізаванымі на ліквідацыю прарываў, якія ёсьць у саўгасе, узяўшы на сябе наступныя абавязкі:

На працягу 2-х дзён ліквідаваць абязьлічку, замацаваўшы кароў і цялят за даяркамі. Палепшыць дагляд асабліва за цялятамі, укараніць зьдзельна-прэміяльную аплату, наладзіўшы сталы і выразны вучот працы ўсіх рабочых.

Для пасьпяховага сканчэньня будаўніцтва, шляхам заключэньня дагавораў з калгасамі, завербаваць 40 рабочых, стварыўшы прэміяльны фонд для будаўнікоў.

Шляхам разгортваньня культурна-масавай работы, таварыскіх сходаў, і праз насьценгазэту павесьці рашучую барацьбу з прагуламі, рвацтвам і лятунамі.

Каб забясьпечыць усё пагалоўе кармамі, правесьці другі ўкос 30 га канюшины для сіласаваньня, поўнасьцю выканаўшы плян сіласаваньня ў 300 тон. Апроч таго, высоўваем сустрэчны плян—засілісаваць яшчэ 100 тон. Ужываць гальлёвы і тарфяны падсьціл, палепшыць 10 га балотнай сенажаці.

Да канца жніўня правесьці вэтэрынарны і зоатэхнічны мінімум і падрыхтаваць кароўнікі і цялятнікі да зімы.

У кожным вучастку саўгасу арганізаваць праверачныя і самаправерачныя брыгады. Безадкладна пачаць масавы збор рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў.

Саўгас Натальеўск зьвяртаецца да ўсіх жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў Чэрвеньскага раёну пайсьці па яго прыкладзе і выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва саўгас «Раванічы» і калгас «Сталіна».

Па даручэньні сходу:

Дырэктар саўгасу Радзюк.
Старшыня рабочкому Вярнікоўскі.
Старшы скотнік Жураўскі.

Патрэбен рашучы паварот

Шклоў. (Наш. кар.). Ня гледзячы на тое, што пытаньню жывёлагадоўлі пар тыяй і ўрадам надаецца вялікая ўвага, на Шклоўшчыне ў гэтым напрамку амаль нічога ня робіцца. Райза стаяць справа ў калгасе імя Валадарскага, гаспадарка каровамі ўкамплектавана, але няма кароўніка. У мінулым годзе мясьціліся 75 кароў у адным хляўчуку, зараз жывёла стаіць

Сьвіні пасьля кармленьня («мёртвы час») у сьвінагадоўчым калгасе.

спусьціла пляны па гадаваньні маладняка як па калгасах, так і аднаасобным сэктары і гэтым адмежавалася ўся справа па жывёлагадоўлі. Да гэтага часу невядома, ці выкананы хоць на палову пляны па гадаваньні маладняка.

Па лініі Райкалгассаюзу па пляну патрэбна арганізаваць у раёне 15 малочных фэрм, але пакуль што толькі ў адным калгасе імя Леніна да палоны выведзены сьцены кароўніка. Астатнія пункты: «Барацьба», імя Валадарскага і інш. нават ня маюць вывезенага лесу. Асабліва востра будзе пад адкрытым небам.

Будаўніцтва сьвінарнікаў ідзе лепш, пабудавана 7 сьвінарнікаў, але поўнасьцю яшчэ не ўкамплектаваны сьвінаматкамі.

Гаспадарнікі з Гарспажыўтаварыства таксама ня могуць дагледзець сьвіней ў прыгараднай гаспадарцы. Сьвіньні пачалі дохнуць ад чумы. Нехта прывёз для здачы ў Скурсындыкат скуру ад заразьлівай сьвіньні, яе чамусьці паклалі ў сьвінарнік, ад гэтага і пачалася чума, ад якой загінула шмат сьвіней.

Г.

Спыніць злачыннае разбазарваньне кармоў

Дуброўна. (Наш. спэцкор). Нарада старшынь сьвінагадоўчых і малочных фэрмаў, якая нядаўна адбылася, выявіла нездавальняючае становішча калгасных і саўгасных фэрмаў. Фэрмы да гэтага часу поўнасьцю не ўкамплектаваны. Калгасныя фэрмы ўкамплектаваны на 30-40 проц. саўгасныя яшчэ менш.

Самі загадчыкі фэрмаў мала цікавяцца сваёй справай, ня прымаюць рашучых захадаў, каб закончыць укамплектаваньне гаспадарак.

Зробленыя падлікі фуражнага балянсу па раёне паказваюць, што ня хопіць значнай колькасьці кармоў. Між тым, загатоўленае сена ў першую чаргу раздаецца на неабагуленыя каровы ад 12 да 30 цэнтнэраў, на галаву. Апроч гэтага, з прычыны адсутнасьці ўсякага нагляду шмат кармоў проста расьцягваецца.

Справа сіласаваньня таксама зрывается. Да гэтага часу плян сіласаваньня выкананы ня больш чым на 5 пр.

Кароткі час, які застаўся, трэба скарыстаць на ліквідацыю гэтых прарываў.

Макарэвіч.

Недапушчальная валакіта

Белдзяржвыдавецтва заўсёды з бясьпечвалася цьвікамі з Белдзяржснабу. Зараз, калі цьвікі сталі яшчэ больш патрэбны БДВ для адгрузі падручнікаў да новага навучальнаг году, Белдзяржснаб чамусьці адмо віўся забясьпечваць і накіраваў з атрыманьнем у мэтызнае кіраўніцтв якое з свайго боку накіравала БДВ ВСНГ. ВСНГ накіраваў назад у Бе дзяржснаб. Белдзяржснаб зноў адмо віў.

Прышлося зьвярнуцца ў РСІ, яка вынесла пастанову: «Белдзяржснаб неадкладна забясьпечваць БДВ цьв камі для адгрузі падручнікаў», але гэтай пастановы таксама мала д бюракратаў Белдзяржснабу. Яны пр цягваюць адшукваць фонды, а ты часам у БДВ ляжыць на мільён ру падручнікаў і масавай літаратур мёртвым капіталам. Цікава, хто буд адказваць за зрыў падрыхтоўкі д новага навучальнага году і мабілізацыі рэсурсаў?

Гурэвіч.

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў дзеяньні

Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі па Рагачэўскім раёне рэалізуецца ўдарнымі тэмпамі. Рад калгасаў, абгаварыўшы гэту пастанову, выносіць практычныя мерапрыемствы па ўзбуйненьні стада жывёлы, па ўтварэньні малочна-таварных і таварна сьвінагадоўчых фэрм.

Калгас «Іскра сацыялізму», абгаварыўшы адозву партыі і ўраду, паставіў на адкорм для здачы дзяржаве 10 галоў сьвіней. Апрача гэтага, 6 калгасьнікаў на агульным сходзе абавязаліся выкармліць і здаць дзяржаве з неабагуленага статка кожнаму па аднэй сьвіньні.

Калгас «Рух», Доўскага сельсавету, у ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК Саюзу, парашыў павялічыць абагуленае стада авец на 50 галоў, сьвіней на 50 галоў і захаваць цялят (ацёлу гэтага году) ад кожнай неабагуленай каровы.

Калгас «Ленінскі Шлях» парашыў да канца бягучага году ўкамплектаваць сьвінагадоўчую фэрму на 50 галоў і пабудаваць сьвінарнік. Апрача гэтага, калгасьнікі згадзіліся абагуліць усіх цялят.

Ёсьць і такія калгасы, дзе асноўная маса калгасьнікаў ня ведае аб гістарычнай пастанове партыі і ўраду па пытаньнях разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, дзе жывёлагадоўля злачынна ігнаруецца.

Да ліку такіх гаспадарак адносіцца камуна «Маладая Гвардыя», Мяркулавіцкага сельсавету.

Між тым становішча жывёлагадоўлі ў камуне надзвычайна дрэннае. Каму на мае шмат цялят, але дагляду за імі ніякага няма, у выніку гэтага цяляты пачынаюць гінуць.

Райкалгасаюз павінен ужыць рашучы меры, каб аздаравіць камуну «Маладая Гвардыя». Трэба сурова пакараць злачынцаў, якія недацэньваюць жывёлагадоўлю і не жадаюць змагацца за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

А. Лугавы.

У адказ на пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР абагулілі ўвесь маладняк

Калгас «Камінтэрн», Койданаўскага раёну, у адказ на адозву ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі пастанавіў абагуліць увесь маладняк, закончыць будаўніцтва аборы на 250 галоў да 1-га верасьня, замест вызначанага калгасам 1-га кастрычніка і засеяць пажніўных культур ня менш 10 га.

Калгас уключаецца ў месячнік агляду сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Для гэтай мэты калгас вылучыў праверачныя брыгады.

П. А.

„ДОМ АСЬВЕТЫ"—29-VIII-г. г. а 6-й гадз. увечары

СКЛІКАЕЦЦА

ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ

Цэнтральнага Праўленьня Саюзу Белпрацасьветы з наступным парадкам дня:

1. Вынікі падрыхтоўчай працы да новага навучальнага году—дакл. НКА і Вытворч. Сэктару ЦП.
2. Матар'яльна прававое-становішча настаўніцтва (праверка выкананьня дырэктыў партыі і ўраду).
3. Мэтадычнае кіраўніцтва масавай школы ў сувязі з політэхнізацыяй (вынікі мінулага году і задачы на 1932 навуч. год.).
4. Аб падрыхтоўцы да Усебеларускага зьезду Саюзу Працасьветы.
5. Бягучыя справы.

Францыя Пленума а 5-й гадз. увечары там-жа. На пленум павінны зьявіцца адназн. сакратары Гк, МК а таксама профаргтыў Саюзу Працасьветы.

Кіраўніцтва ЦП Саюзу

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" на „Спартаку"

„Ліквідаваць абязьлічку, палепшыць арганізацыю працы, правільна расставіць сілы на прадпрыемстве..., палепшыць бытавыя ўмовы рабочых,--такава задача" (Сталін)

Брыгада «Савецкай Беларусі» на фабрыцы «Спартак». Зьлева направа сядзяць: Кандраценка («Спартак»), Бардоўская (Саюзпапера), Гарын («Савецкая Беларусь». Стаяць: Бобрыкаў і Сулькін («Спартак»).

З 1 жніўня па 20-е па папяровай фабрыцы «Спартак» працавала выязная брыгада нашай газэты.

Брыгада ставіла перад сабой задачу мабілізацыі грамадзкай думкі да пытаньняў выкананьня вытворчай праграмы, падвышэньня якасьці прадукцыі, фарсыраваньня тэмпаў будаўніцтва і вырашэньня пытаньняў рабочага забясьпечаньня.

Пры дапамозе мясцовай партыйнай арганізацыі і грамадзкіх арганізацый самой фабрыкі, брыгада здолела мабілізаваць ударнікаў і рабкораў і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал на зьнішчэньне перашкод, якія тармазілі работу аднэй з буйнейшых папяровых фабрык БССР.

У другой палове жніўня намеціўся пералом у колькасных і якасных паказьніках выкананьня прамфінпляну. Апошняе паведамленьне з фабрыкі гаворыць, аб тым, што ў паасобныя дні прамфінплян выконваецца да 94 проц. (замест 61 проц. у першым паўгодзьдзі). Якасьць прадукцыі палепшылася і колькасьць скарг спажыўцоў на дрэнную якасьць паперы зьменшылася. Адным з самых вузкіх месц работы фабрыкі да сучаснага моманту зьяўляецца адбудова чатырох згарэўшых цэхаў.

24 Жніўня ў рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» адбылася заключная нарада выязной брыгады сумесна з прадстаўнікамі рэспубліканскіх аб'яднаньняў: Белдзяржбуду, Саюзпаперы, Белдзяржснабу і прадстаўнікоў Шклоўскіх партыйных і прафэсыянальных арганізацый. Нарада прыняла цэлы рад канкрэтных рашэньняў аб далейшай рабоце фабрыкі «Спартак».

У выніку работы нарады, 25-VIII вылучаная спэцыяльная брыгада наведала старшыню Белкаапсаюзу тав. Хаскіна, з якім брыгада пагадзіла цэлы рад пытаньняў рабочага забесьпячэньня па фабрыцы «Спартак».

Апарат Белкаапсаюзу «перабудоўваецца».

Фабрыка „Спартак" павінна працаваць па-ўдарнаму, па-баявому

Абвясьціць бязьлітасную барацьбу з безгаспадарчасьцю, „абломаўшчынай", апартуністычнымі настроямі, якія цягнуць фабрыку ў процьму прарываў

Рашуча перабудаваць работу па-новаму. У аснову далейшай работы пакласьці ўказаньні т. Сталіна

(ПА МАТАР'ЯЛАХ НАРАДЫ ПРЫ РЭД. «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ»)

Папера ў культурнай рэвалюцыі заклікана адыграць ролю буйнейшага матар'яльнага фактару. З году ў год нязьмерна шпарка ўзрастаюць культурныя запатрабаваньні, шпаркімі тэмпамі пашыраюцца нашыя ідэалёгічныя рэсурсы.

На нашых вачох адбываюцца найвялікшыя гістарычныя зьявішчы, ліквідацыя няпісьменнасьці цэлай краіны, усеагульнае пачатковае навучаньне, бурны рост нашага друку і выдавецкай справы.

Посьпехі сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі далі магчымасьць дамагчыся гэткіх-жа посьпехаў на фронце культурнага будаўніцтва.

У струмені шпаркіх тэмпаў сацбудаўніцтва на жаль выяўляецца адставаньне нашай папяровай прамысловасьці. Матар'яльная база разумовай культуры—папера—стала надзвычайна вузкай. Атрымаўся разрыў паміж узросшымі патрэбамі мас і матар'яльнымі магчымасьцямі друкаванай і выдавецкай справы. Партыя і друк кінуліся ў бой за паперай, у бой за выкананьне вытворчай праграмы 611.000 тон у 3-м годзе пяцігодкі.

Беларусь—краіна лясоў, краіна невычарпальных магчымасьцяй для разьвіцьця папяровай прамысловасьці. У агульным балянсе папяровых рэсурсаў краіны, БССР уносіць буйную долю. Гэтыя меркаваньні зьявіліся прычынай рэзкага павароту друку тварам да папяровай прамысловасьці.

Перад савецкай грамадзкасьцю адкрываюцца жудасныя малюнкі безгаспадарчасьці і ганебнага адставаньня паперфабрык ад агульнага тэмпу сацбудаўніцтва.

***

Фабрыка «Спартак» адна з буйнейшых фабрык БССР. Штодня з накату не папяровых машын краіна павінна атрымаць 43 тоны паперы ці 15.480 тон у год. У першым паўгодзьдзі 31 г. фабрыка ня выканала свае вытворчыя праграмы, не гаворачы ўжо аб выкананьні сустрэчнага пляну. Толькі ў палове жніўня намеціўся некаторы пералом, але зноў як і раней «Спартак»—ня можа выйсьці з паласы якасных прарываў.

Чэрвень быў месяцам катастроф і цяжкіх выпрабаваньняў. Ад подлай рукі шкодніка згарэла палова фабрыкі. Гэтым быў нанесены вялікі ўдар у самае сэрца. Рабочыя ўдарнікі аднавілі фабрыку ў 6 дзён. Папяровыя машыны запрацавалі зноў.

Не пасьпелі залатаць сьвежыя раны, як зноў вытворчасьць трапіла ў ганебнае кола прарываў. Ліпень быў месяцам якасных перабояў. Гатовая прадукцыя фабрыкі зьвярталася на склады. Спажыўцы прысылалі вялікую колькасьць скаргаў. На маскоўскіх тытунёвых фабриках нізкаякасная спартакаўская папера давала надзвычайна вялікі брак і наносіла тытунёвай прамысловасьці буйныя страты. Дзесяткі і сотні тысяч руб. выкідаліся на вецер. Работніцы маскоўскіх фабрык з кожным днём зьнижалі прадукцыйнасьць сваёй працы, а значыцца і заработак. Папера «кожную хвіліну рвалася, ня было ніводнага станоўчага паказьніка для якасьці паперы: вага пераўвялічена, вялікая зольнасьць, нераўнамерная шчыльнасьць і вялікі процант пяску. Ад дрэннай якасьці прадукцыі фабрычная кішэня пусьцела. Нявыкананы прамфінплян не гарантаваў банкаўскага крэдыту. Ня было сродкаў на аплату сыравіны і выдаткаў, за пратэрмінаваньне плацяжоў трэба было плаціць пеню, а дрэнная якасьць паперы і вялікі брак—клаліся цяжкім каменем накладных выдаткаў на вытворчы гаспадарчы разьлік.

„Спартак" ня змог сваячасова перабудаваць работу па новаму. Указаньні т. Сталіна ня былі пачуты работнікамі фабрыкі

Чаму фабрыка так глыбока завязла ў ціне чарапашых тэмпаў?

1931 год зьяўляецца годам новых гаспадарчых эрухаў, аднак кіраўнікі папяровай прамысловасьці, кіраўнікі фабрыкі не зразумелі што мы апынуліся ў новых гаспадарчых абставінах. Работа ішла па-старому, старымі мэтадамі. Ня ўлічылі, што існуе гаспадарчы разьлік, новая форма крэдытаваньня, што посьпехі калгаснага руху і рост матар'яльнага дабрабыту сялянскіх мас патрабуе адмаўленьня ад стаўкі на «самацёк». Гаспадарнікі не зразумелі ,што патрэбны новыя мэтады набору і захаваньня рабочай сілы.

Прафэсыянальная арганізацыя ў сваю чаргу не зразумела таго, што ранейшая сыстэма аплаты працы не адпавядае тэхнічным і эканамічным умовам разьвіваючайся прамысловасьці. На фабрыцы ня думалі перабудоўваць работу па новаму. Гэтага ня робяць і зараз. «Спартак» як і раней пакоцца ў чароўным сьне, старыя мэтады работы цьвёрдай броняй скавалі гаспадарчы арганізм вялікай вытворчасьці.

Над машынамі-варштатамі няма гаспадара. Старыя капрызныя варштаты патрабавалі дагляду, а замест гэтага панавала разлагаючая абязьлічка. У папяровых машын ня было сталых брыгад. Брыгады былі «сьлізгавымі». Абязьлічка як хвароба распаўзлася. Ад цэхаў яна прасякнула ў канторы, у пляны і распараджэньні. Безгаспадарчасьць адчувалася на складах, у дваровай гаспадарцы. Імпартнае абсталяваньне валялася на дварэ бясплатульным. Дорага каштоўныя сукны папяровых машын ад дрэннага дагляду псаваліся вельмі шпарка. Машыны чысьціліся рэдка, і пакрываліся тоўстым пластом папяровага пылу і машыннай алівы.

Дрэнны дагляд за агрэгатамі зьяўляўся прычынай частых аварый. Аварыі давалі ахвяры. Гінулі сродкі, калечыліся людзі... На «Спартаку» яўна адчувалася зьнижэньне прадукцыйнасьці працы. Родная сястра абязьлічкі—дрэнная дысцыпліна й сваю чаргу пагрыбіла зьнижэньне прадукцыйнасьці працы. У першым паўгодзьдзі 1931 г. было вынесена 418 дысцыплінарных спагнаньняў. І нічога дзіўнага, бо былі выпадкі, калі рабочыя пакідалі работу і варштат. На прынцып адзіначальня рабіліся вылазкі. У цэхах ня слухаліся загадаў дзяржаўнага майстра. заг. цэхам і нават дырэктара.

У рабоце ўсяго вытворчага арганізму як у сапсаваным гадзіньнікавым мэнізьме ня было слажанасьці частак. Работа ішла з перабоямі. І ў выніку сабекошт вытворчасьці замест зьнижэньня на 13 проц. прагрэсыўна падвышаўся: + 2,5,+3,5+7,8 і нарэшце +15,3.

У заработку ўкаранілася сыстэма ўраўнілаўкі. Высокакваліфікаваны рабочы мэханічнай майстэрні, сетачнікі папяровых машын ня былі зацікаўлены ў рабоце. Часамі рабочы з кваліфікацыяй і вялікім вытворчым вопытам аплачваўся нараўне з маладой некваліфікаванай работніцай (сартоўшчыцай). Сярод работніц аднаго і таго-ж цэху існавала розная форма разьліку заработку, (падзённая і зьдзельная). Зьдзельшчына ўпарта ня ўводзілася. Да гэтага важнейшага пытаньня кіраўніцтва фабрыкі выказвала выключны «алімпійскі» спакой.

Ад ураўнілаўкі пайшоў нябачны ланцужок да цякучасьці рабочай сілы. За першую палову 1931 году было прынята і звольнена рабочых у два разы больш сьпіскавага складу. На нарадзе пры газэце «Савецкая Беларусь», калі абгаворвалася пытаньне аб выніках работы выязной брыгады ілюстраваліся факты якія яскрава характарызуюць няўменьне прыстасавацца да новых гаспадарчых абставін, няўклюднасьць адміністрацыйнага кіраўніцтва, адсутнасьць гаспадарчага разьліку ў брыгадзе, цэху і па ўсёй фабрыцы.

Фабрыка «Спартак» цягнулася ў хвасьце вытворчасьцяй, спазьніўшыся правесьці ў жыцьцё зазначэньні т. Сталіна.

„Дайце новыя машыны і мы выканаем прамфінплян"...

Прычыны ўсіх прарываў некаторыя «разумнікі» зводзяць да аднаго—да застарэлага абсталяваньня. Гэта яўна няправільныя зацьверджаньні. Выкананьць прамфінплян рабочыя маглі калі-б было зроблена што небудзь для перабудовы кіраўніцтва. Факты гэта падцьвярджаюць. Былі паасобныя жніўньскія дні калі зьмены і брыгады лепшых ударнікаў давалі 129 і нават 137 проц. выкананьня пляну. Бывалі такія дні калі прамфінплян усёй вытворчасьці дасягаў 94 проц. выкананьня. Адміністрацыя і інжынэрна-тэхнічны персанал зрабілі вельмі мала для максымальнага скарыстаньня існуючага абсталяваньня і прывядзеньня яго ў парадак. Указаньні камісіі ЦК, Саюзпаперы і БГУ саюзпаперы па тэхнічнай экспэртызе ня выконваліся. Рамонт прасілаваў станцыі зацягваўся надзвычайна доўга. Рабочыя прапановы па рацыяналізацыі вытворчага працэсу сваячасова ня выконваліся. У выніку гэтага за першае паўгодзьдзе было праведзена ў жыцьцё, усяго 33 рабочых прапановы.

Умяшаньне друку прывяло да некаторага пералому. За адзін жнівень месяц, калі брыгада друку была на «Спартаку» рабочых прапаноў паступіла ў 6 разоў больш, чымся за ўсё першае паўгодзьдзе.

Брыгада цьвёрда ўстанавіла, што толькі благадушна гаспадарнікаў прыняло да таго, што ў тэхналёгічным працэсе вытворчасьці ня было ўведзена самых элемэнтарных палепшаньняў. (Скарыстаньне зваротных вод машын, пастаноўка эканамайзэраў, скарыстаньне кандэнсату пары і г. д. і г. д.). Неўважлівыя адносіны да тэхнічных нарад прывялі да расхалоджваньня рацыяналізатарскага руху. Рамантуючы старое абсталяваньне, патрабуючы ад яго высокай максымальнай прадукцыйнасьці, фабрыка зусім правільна ставіла пытаньне аб маторах для прыёмкі току Белдрэсу. Калі ГЭТ дасьць маторы?.

Гэтае пытаньне прадоўжае хваляваць усю грамадзкасьць фабрыкі.

У свой час на фабрыцы сьцьвярджалі, што масавай работы нельга будзе весьці да таго часу, пакуль фабрыка не атрымае белдрэсаўскага току і, такім чынам, упарадачыць сваю гаспадарку. Надзеі на атрыманьне новага абсталяваньня былі настолькі значнымі ,што на фабрыцы нічога не рабілася для рамонту старога абсталяваньня і прывядзеньня ў парадак энэргетычнай гаспадаркі. Такое становішча інакш нельга расцэньваць як спасыланьне на самацёк.

Ад дзьвюх нянек дзіця без носу (Саюзпапера ці Белпапера?)

Гаспадар фабрыкі «Саюзпапера» ся дзіць у Маскве. Для лепшага кіраўніцтва БССР створана Беларускае групавое кіраўніцтва «Саюзпаперы». Пасадзілі кіраўніцтва, але не далі яму ўлады. Работнікі з БГУ выяжджалі на фабрыку, «мацалі пульс», прыпісвалі рэцэпты, давалі добрыя парады—але не кіравалі. На «Спартаку» інструктароў БГУ церпяліва выслухоўвалі... гэта ў лепшым выпадку.

У горшым выпадку на прадстаўнікоў БГУ не зьвярталі ўвагі, або гналі з вытворчасьці. «Наш гаспадар у Маскве»,—гаварылі ў такіх выпадках. А «Саюзпапера» далёкай Масквы цьвёрда запамятала прыказку—«Далей вочы—лягчэй сэрцу».

Зусім правільна на нарадзе пры рэдакцыі заваструілі ўвагу на гэтым пытаньні (Млоцін і Бардоўская). Або «Саюзпапера», або Беларускі папяровы трэст. Нарада рэзка ставіць пытаньне—скольки часу БГУ «Саюзпаперы» будзе займацца «малітвамі».

На фабрыцы ідэе будоўля... „по винтику, по кирпичику"

Урад не шкадаваў грошай для аднаўленьня фабрыкі. Патрэбна папера, значыцца трэба ва ўдарным парадку будаваць і аднавіць згарэўшыя цэхі Белдзяржбуд узяў на сябе будоўлю Фабрыка «Спартак» абавязалася даць цэглу, цамэнт і жалеза. Сваё абавязацельства фабрыка выканала. Матарыял ёсьць, ёсьць і каменшчыкі. Няма толькі аднаго... тэмпаў. Прараб Белдзяржбуду тав. Захарчанка ня любіць, як відаць, тэмпаў у рабоце. Ён чалавек спакойны, з расстаноўкай. На тэхнічных нарадах, якія адбываліся не аднаразова на вытворчасьці, ён урачыста даваў абяцаньні аб сканчэньні будоўлі максымум у 2 тыдні. Да сёньняшняга дня, як гэта канстатавалася на нарадзе, будаўніцтва прасоўваецца вельмі марудна. На каменных работах каменшчык кладзе ўсяго 300 цаглін у дзень. Ужо цяпер вызначылася рэальная пагроза васеньскіх дажджоў для фабрыкі. У незакрытых цэхох ад дажджу мокне папера, іржавеюць варштаты і псуе сваё здароўе рабочы.

Палепшыць рабочае забясьпечаньне—значыць быць рвачамі

Так мяркуюць некаторыя на «Спартаку», калі гаворань аб вапіючых фактах дрэннай пастаноўкі рабочага забясьпечаньня. Рабочыя «Спартаку» атрымліваюць па 3-м сьпісе. Значыць яны павінны атрымаць: цукар, крупу... 5 месяцаў Белкаапсаюз засылае нарады на цукар з Аршанскай базы, 5 месяцаў цукру няма. У такі час рабочыя чакаюць належнай ім нормы круп. 18 жніўня ўляршыню былі выданы крупы, але іх ніхто ня мог спажываць, бо яны былі тухлыя.

Забесьпячэньне будзе наладжана (Брыгада „С. Б." у старшыні БКС т. Хаскіна)

Наша брыгада, вылучаная нарадай пры рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь», бачачы, што прадстаўнік Белкаапсаюзу тав. Войкаў на нарадзе нічога пэўнага і канкрэтнага не сказаў па адным з важнейшых і балючых пытаньняў фабрыкі «Спартак»—аб рабочым забясьпечаньні, накіравалася непасрэдна да старшыні Белкаапсаюзу тав. Хаскіна.

Абмаляваўшы малюнак абураючага становішча рабочага забясьпечаньня і грамадзкага харчаваньня на фабрыцы, брыгада патрабавала ад тав. Хаскіна канкрэтных тлумачэньняў і неадкладнага рэагаваньня на нашы матэрыялы.

Аказваецца, што ўсе лісты, дасылаемыя Шклоўскім гарспажыўтаварыствам аб такіх абураючых зьявішчах, як напрыклад, адсутнасьць на працягу 5 месяцаў цукру для рабочых прадпрыемстваў Шклову, адсутнасьць якой-быта ні было гарбаты, пэрыядычны недахват хлеба і г. д. і г. д.—усе гэтыя лісты заставаліся ў папках аддзелаў БКС і ніхто ня толькі не рэагаваў на іх, але ніводнага разу не паведаміў старшыню БКС аб агідным становішчы ў Шклове.

Галоўным пытаньнем у гутарцы з тав. Хаскіным зьяўлялася пытаньне пераводу рабочых фабрыкі «Спартак», па прыкладзе іншых папяровых прадпрыемстваў, з III-га сьпісу забясьпечаньня у II-гі. І тут мы сустрэлі цікавы факт, які вельмі яскрава сьведчыць аб «наладжанасьці» работы апарату БКС. Супрацоўніца сэктару снабжэньня тав. Хаздан заявіла, што фабрыка «Спартак», паводле кантынгентаў Белкаапсаюзу, з 1-га/жніўня пераведзена ў II-гі сьпіс. Гэтую сваю заяву яна матывавала наяўнасьцю адпаведных дакумантаў. Але гэтым словам нельга было даць веры, таму, што мы добра ведалі, што за 25 дзён жніўня справа рабочага забясьпячэньня на фабрыцы «Спартак» ні на крок ня зрушылася ў бок палепшаньня. На падставе гэтага тав. Хаскін папрасіў прадставіць яму пэўныя дакуманты і калі пасьля доўгіх шуканьняў былі нарэшце, знойдзены гэтыя дакуманты, дык аказалася, што фабрыка «Спартак»... як і раней знахо дзіцца ў III-м сьпісе.

Між іншым, трэба адзначыць, што дагэтуль рабочыя фабрыкі «Спартак» і па трэцім сьпісе амаль нічога не атрымліваюць, як відаць з матэрыялаў надрукаваных у газэце «Савецкая Беларусь» раней і матэрыялаў нарады.

На нашы патрабаваньні даць пэўны і канкрэтны адказ, што Белкаапсаюз зараз-жа зробіць для палепшаньня забясьпячэньня рабочых фабрыкі «Спартак», тав. Хаскін заявіў, што з чацьвёртага кварталу, г. зн. з кастрычніка месяца б. г. фабрыка «Спартак» напэўна будзе пераведзена ў II-гі сьпіс.

—Але і зараз,—сказаў далей т. Хаскін, мы зробім усе магчымае для палепшаньня забесьпячэньня фабрыкі «Спартак». Я зараз-жа дам распараджэньне, каб Аршанская база адгрузіла «Спартаку» цукар і даручу неадкладна высьвятліць пытаньне з хлебам.

Далей мы перайшлі да пытаньня снабжэньня рабочых фабрыкі «Спартак» гароднінай з Шклоўскай прыгараднай гаспадаркі.

Шклоўскі райснаб, на падставе загаду Наркамснабу прапанаваў Шклоўскаму райспажыўтаварыству адгрузіць іншым гаралом... 220 тон рознай гароднины з прыгараднай гаспадаркі, што пагражае ўсяму забесьпячэньню рабочых «Спартака» с/г. прадуктам.

Згаджаючыся з брыгадай, што гэтае распараджэньне Шклоўскага райснабу зьяўляецца няправільным і недапушчальным, тав. Хаскін тут-жа даў тэлеграму Шклоўскаму райспажыўтаварыству наступнага зьместу:

«Прадукцыяй прыгараднай гаспадаркі ў першую чаргу забясьпечце рабочых прадпрыемстваў Шклову».

— Апроч таго,—сказаў т. Хаскін,—я дагаварыўся з Наркамснабам т. Балцінным аб адмене распараджэньня Шклоўскага райснабу.

Вялікае значэньне ў палепшаньні рабочага забесьпячэньня адыгрываюць самастойныя загатоўкі спажыўкаапэрацыі. Шклоўская гарспажыўтаварыства да гэтага часу не магло рабіць якіх-небудзь загатовак таму, што райспажыўсаюз не даваў яму на гэта дазволу.

На наша запытаньне наконт гэтага, тав. Хаскін перадаў нам наступную тэлеграму, падпісаную ім і Наркамснабам тав. Балцінным, адрасаваную райснабам і райспажыўсаюзам:

«Прапануецца неадкладна адмяніць усякае абмежаваньне работы спажыўкаапэрацыі ў загатоўцы гароднины, бульбы ва ўсіх сэктарох у межах усяго раёну...».

***

Як відаць з пададзенага вышэй, Белкаапсаюз, у асобе яго старшыні, тав. Хаскіна, неадкладна рэагуе на патрабаваньні нашай брыгады. Трэба спадзявацца, што ня менш хутка будуць практычна ажыцьцёўлены ўсе абяцаньні. Але сёньня, 27-га жніўня, праз 2 дні пасьля нашай гутаркі, яшчэ не паслана тэлеграма Шклоўскаму райснабу, НКС і БКС аб адмене яго распараджэньня наконт адгрузкі гароднины з прыгараднай гаспадаркі.

Астатнія распараджэньні, праўда, зроблены і зараз галоўнае ў іх практычным выкананьні Аршанскай базай, Шклоўскім райспажыўсаюзам і гарспажыўтаварыствам.

Аднак, і гэтага яшчэ будзе мала. Галоўнае ў тым, каб само Шклоўскае гарспажыўтаварыства паленшыла сваю работу. Ад яго, больш чым ад каго бы то ні было залежыць справа палепшаньня рабочага забесьпячэньня фабрыкі «Спартак». Яму зараз даны і будуць даны ў далейшым усе магчымасьці для разгортваньня работы. Трэба зараз-жа, па-ўдарнаму разгарнуць унутры-раённыя загатоўкі, паленшыць санітарнае становішча сталовак і крам, загатовіць і забясьпечыць у адпаведным выглядзе гароднину на зімовы час і г. д.

Пад кіраўніцтвам раённай партыйнай арганізацыі Шклоўскае гарспажыўтаварыства павінна перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з адозвай ЦК УсеКП(б), СНК СССР і Цэнтрасаюзу і пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР, спрыяючы тым самым ліквідацыі вытворчага прарыву фабрыкі «Спартак», дапамагаючы ёй стаць у першыя рады прадпрыемстваў БССР.

Брыгада газ. «Сав. Бел.»
Маркаў, З. Гарын,
О. Громаў. («С. Б.»).
Бардоўская («Белпапера»).
Кандраценка, Сулькін,
Бобрыкаў (ф-ка «Спартак»).

Новыя сыгналы з рыштаваньняў пабудовы

Будаўнічыя работы на „Спартаку" зрываюцца. Калі на будоўлі ня будзе пералому ў тэмпах, фабрыка ўзімку павінна стаць. Прадукцыйнасьць працы і дысцыпліна сярод сэзоньнікаў падае

Становішча будаўніцтва па аднаўленьні згарэўшых цэхаў фабрыкі «Спартак» працягвае заставацца нездавальняючым.

25 жніўня на будаўніцтва яшчэ ня было пералому, ня гледзячы на катэгарычныя распаньні тэхнічнай нарады, канферэнцыі рабочых фабрыкі і сыгналы «Савецкай Беларусі».

Дысцыпліна сярод будаўнікоў выключна дрэнная. На будоўлі можна наглядаць зьявішчы, калі цэлыя групы рабочых стаяць нічога ня робячы.

Ня ў лепшым становішчы прадукцыйнасьць працы. Пры будаваньні брандмаўёра муляры даюць 250-300 паглін у дзень, у той час як звычайная сярэдняя прадукцыйнасьць муляра 800-1000, а пры 10-ці гадзінным рабочым дні 1000-1200 цаглін. Нізкая прадукцыйнасьць муляроў, тым больш дзівіць, што кладка ідзе на гладкай сьцяне.

Вось ужо трэці тыдзень як гэта капітальная сьцяна будуецца і паднята толькі на 2-3 мэтры.

Такія тэмпы ствараюць небясьпеку, што сьцяна ня будзе сваячасова выведзена для пакрыцьця. Адбудова фабрыкі працягвае заставацца пад пагрозай зрыву, а значыцца і работа ўсёй фабрыкі пад рэальнай пагрозай зрыву.

Калі ня будзе ўцеплена фабрыка на зіму, уся сыстэма воднага харчаваньня і пара-сілавой гаспадаркі ня будзе дзейнічаць. Фабрыку прыдзецца зачыніць.

Гэтага ня ўлічылі работнікі Белдзяржбуду і адміністрацыя фабрыкі «Спартак». Прафэсыянальныя арганізацыі не вядуць ніякай работы сярод будаўнікоў. Не даецца адпор рвацкім патрабаваньням асобных груп рабочых. Так, за ўстаноўку шатра (ўцяпленьня) ваданапорнага бака будаўнікі прасілі 1000 руб., не згаджаючыся на 700 руб., запрапанаваныя прарабам (па расцэнцы 300 руб.). Па цэлым радзе іншых работ будаўнікі просяць у чатыры разы больш існуючых расцэнак.

Культработа сярод будаўнікоў не вядзецца і зусім зразумела чаму цэлы рад мерапрыемстваў застаюцца не даведзенымі да ведама сэзоньнікаў.

Г. Калінінаў.

Новыя гаспадарчыя абставіны патрабуюць работы па-новаму

Брыгада «Савецкая Беларусь» і рабочая брыгада маскоўскіх тутунёвых фабрык не маглі бязуважна адносіцца да стану фабрыкі «Спартак». Жнівень месяц быў месяцам напружанай работы па мабілізацыі фабрычнай грамадзкасьці вакол пытаньняў прамфінпляну, адбудовы фабрыкі і палепшаньня рабочага забясьпечаньня.

Дзейнасьць брыгад задарма не прайшла. Другая палова жніўня паказвае наяўнасьць пералому як у пытаньнях выкананьня прамфінпляну, так і ў пытаньнях палепшаньня рабочага забясьпечаньня. Перад адбудоўваемай фабрыкай «Спартак» паўстаюць вялікія задачы перабудовы работы па-новаму. Друк ужо неадназаразова зазначаў на тыя канкрэтныя мерапрыемствы, якія могуць узьняць фабрыку «Спартак» і вывесьці яе ў лік перадавых вытворчасьцяй. Нарада 24-VIII яшчэ раз аўтарытэтна пацьвердзіла, што фабрыка мае ўсе магчымасьці для выкананьня ўрадавага заданьня па выпуску паперы. Для таго, каб «Спартак» ліквідаваў сваё адставаньне трэба безадкладна з бальшавіцкай упартасьцю правесьці ў жыцьцё наступныя рашэньні нарады:

1) у Беларусі трэба арганізаваць рэспубліканскі трэст папяровай прамысловасьці. Фабрыка «Спартак» павінна атрымліваць кіраўніцтва ад беларускіх гаспадарчых арганізацый;

2) адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал павінен безадкладна ўзяцца за правядзеньне ў жыцьцё пастановы камісіі ЦК, якая працавала ў свой час на фабрыцы «Спартак». Трэба правесьці ў жыцьцё ўсе ўказаньні, даныя ў свой час з мэтаю максымальнага скарыстаньня вытворчых магчымасьцяй фабрыкі;

3) трэба аднавіць пара-сілавую гаспадарку фабрыкі. Мы патрабуем ад «ГЕТ-у» выкананьня заказаў на маторы;

4) нельга пакінуць фабрыку без пэрспэктыў. Неабходна настойліва патрабаваць распрацоўкі ад плянавых арганізацый наступнага пяцігадовага разьвіцьця папяровай фабрыкі «Спартак». У 1932 годзе павінна быць ажыцьцёўлена праграма тэхнічнай рэканструкцыі ф-кі, яе пашырэньня і пераход на новыя віды сыравіны;

5) для фабрыкі павінна быць створана цьвёрдая палавая база. Торфзавод «Вольніца» павінен быць пашыраны;

6) безадкладна перабудаваць работу каапэрацыі, паставіць спартакаўскіх рабочых у больш нармальныя ўмовы для работы. Рэспубліканскія каапэрацыйныя органы павінны заняцца пытаньнем перабудовы фабрычнай каапэрацыі.

Выканаць пастаўленыя задачы фабрыка «Спартак» здолее тады, калі ўся работа вытворчасьці, пачынаючы ад канторы і канчаючы цэхам, будзе падпарадкавана той праграмнай прамовы, якая была сказана тав. Сталіным па нарадзе гаспадарнікаў.

З. Гарын.

ЗВОДКА

выкананьня вытворчай праграмы фабрыкі „СПАРТАК"

Дата	Выпушч. прадукцыя ў тонах	Проц. вып. дзённага плану	Процант прастою абсталяв.
17 жніўня . . .	13,127	40,60	39,69
18 „ . . .	30,686	82,10	12,62
19 „ . . .	34,191	91,21	8,79
20 „ . . .	28,231	77,39	16,08
21 „ . . .	34,881	90,71	11,69
24 „ . . .	34,310	88,63	13,65

У бой за торф

Торфазавод „Вялікі Мох“ у палоне прарываў“

Неадкладна праверыць кіраўнічы склад заводу

Торфазавод «Вялікі Мох» яшчэ дагэтуль не пераключыўся на ўдарныя тэмпы выпрацоўкі торфу.

Кожная пяцідзёнка гаворыць аб тым, што на торфазаводзе прарыў. Замест 540 тон торфу за пяцідзёнку выпрацоўваецца толькі... 120 тон. Завод кожную пяцідзёнку не дадае краіне 420 тон торфу.

Чым-жа гэта тлумачыцца?

Гэта тлумачыцца тым, што дырэкцыя заводу зусім не клапоціцца аб палепшаньні ўмоў работы заводу. Торфмашына ўстаноўлена толькі адна, а аб другой дырэкцыя і думаць не хоча. Культывыхаваўная работа ся ход рабочых торфянікаў зусім не праводзіцца. Рабочыя не забясьпечаны спецвопраткай (між іншым яна ёсьць, але пад замком). Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнуты. У сталоўцы поўна бруду. Гэта прымушае рабочых працаваць з халадком, а некаторыя зусім пакідаюць завод. Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК аб торфадабычы да рабочых торфянікаў не даведзена. Кіраўніцтва заводам зусім слабое. Калі маецца цякучасьць рабочых, адміністрацыя пішкіх мер да замацаваньня рабочых ня прымае. Шмат дзеятнікаў зусім бязьдзейнічаюць у адносінах вучоты працы. Рабочыя гэтым не задаволены і патрабуюць умяшаньня ў гэту справу пракуратуры і РСІ.

Бліжэйшая да заводу Склімінская парт'ячэйка не стаіць на чале кіраўніцтва заводам.

Належныя органы павінны безадкладна пераглядзець кіруючы склад заводу і разьбіць «абломаўшчыну», непаваротлівасьць і няздольнасьць працаваць і выканаць пляны. Трэба прымусіць нарэшце, адміністрацыю торфазаводу «Вялікі Мох» па ўдарнаму наладзіць працу і пераключыцца на ліквідацыю маючагася прарыву.

П. Кавалёў.

Зводка выкананьня пляну па торфаздабычы на торфазаводах БССР за 23 жніўня 1931 г.

Назва заводаў	Проц. выкан. сэзон. пляну	Проц. выкан. дзён. пляну
Застаюцца наперадзе:		
„Закрашынскі Мох“	89,1	135,6
„Першага Мая“	58,4	127,6
„Чырвоны Тарфянік“	101,4	96,7
„Бальшавік“	75,9	79,5
Ганебна правальваюць торфаздабычу		
„Чырвоны Сьцяг“	29,1	6,5
„Чырвоная Беларусь“	8,5	10,5
„Смалявічы“	29,5	12,5
„Калектыўная Праца“	13,6	25,1
„Зьвязда“	43,7	21,0
„Новая Беларусь“	77,8	27,8
„Шлях Сацыялізму“	52,6	27,9

Па ўсіх торфазаводах БССР сэзонны плян выканан на 47,2 проц., а дзённае заданьне за 23VIII—на 23,8проц.

Масавымі суботнікамі дапаможам выканаць плян торфаздабычы

Камсамольская ячэйка м. Старасельле, Талачынскага раёну, арганізавала суботнік на торфараспрацоўкі, у якім прымалі ўдзел ня толькі камсамольцы, але і дарослыя таварышы, якія прыехалі ў Старасельле ў адпачынак. Грошы зароблены ад суботніка перададзены на пазыку «3-ці рашаючы».

Камсамольская ячэйка мяркуе арганізаваць яшчэ раз такі суботнік.

Ул. Арэшкаў.

П. Бузук, Я. Мацюкевіч, Г. Юргелевіч

Мэханіцызм пад шыльдай марксызму

У 3 нумары «Полымя» за 1931 год зьмешчаны побач два артыкулы на мовазнаўчыя тэмы—«Бойкі на мовазнаўчым фронце» праф. Баркоўскага і М. Бочачэра «Лінгвістычная дыскусія». Прачытаўшы абодвы артыкулы, незнаёмы з пытаньнямі марксысцка-ленінскай мэтодолёгіі мовазнаўства, чытач разьвядзе рукамі і паставіць пытаньне: «на чым-жа баку праўда».

Бясспрэчна, трэба вітаць рэдакцыю «Полымя», якая ўспомніла аб лінгвістыцы самым занядбаным вучастку ідэолёгічнага фронту, але кепска яна зрабіла што надрукавала два дыямэтральна-процілеглыя па сваіх прынцыповых установках артыкулы, ня вызначыўшы сваёй позыцыі да данага пытаньня.

Азнаёміўшыся з абедвума артыкуламі, дырэкцыя Інстытуту мовазнаўства палічыла сваім абавязкам унесьці яснасьць у закранутыя пытаньні, тым больш, што праф. Баркоўскі надрукаваў свой артыкул з заўвагай, што гэты артыкул чытаўся ім у Інстытуце мовазнаўства БАН.

Ва ўступнай «прамове» (Sic!) праф. Баркоўскі аўторытэтным тонам прызнае актуальнасьць сваёй тэмы («Бойкі на мовазнаўчым фронце»), паскольки яна зьвязана з пытаньнем аб шляху, якім пойдзе Інстытут Мовазнаўства БАН. Прымаючы пад увагу прыведзеную заяву разам з заўвагай у зносцы да артыкулу, чытач можа падумаць, што праф. Баркоўскі гэтым дакладам паказвае шлях Інстытуту Мовазнаўства, вызначае генэральную лінію яго працы.

Зразумела, тэма аб бойках на мовазнаўчым фронце зьяўляецца вельмі актуальнай, асабліва ва ўмовах БССР, дзе мовазнаўства было арэнай барацьбы клясава-варожых сіл—нацыянал-дэмократаў і вялікадзяржаўных шовіністаў—супроць лініі партыі, але позыцыі, занятыя праф. Баркоўскім, не зьяўляюцца позыцыямі Інстытуту Мовазнаўства. Вось і таму яшчэ, каб ня было непаразуменьня ні ў чытача, ні ў самога праф. Баркоўскага, даклад якога быў прачытаны ў Інстытуце Мовазнаўства, але па незалежных ад Інстытуту прычынах не атрымаў у свой час ацэнкі, дырэкцыя Інстытуту і лічыць неабходным выступіць у друку з ацэнкай дакладу Баркоўскага, выявіўшы сваю лінію ў пытаньнях мовазнаўства.

У сваім артыкуле т. Баркоўскі заяўляе, што на лінгвістычным фронце «стыкнуліся дзьве сілы: інда-эўропэістыка, у тым ліку і «соцыялёгічнае» яе крыло, і марксысцкае мовазнаўства, прадстаўленае яфэтычнай тэорыяй». З гэтай цытаты, як і з усяго артыкулу Баркоўскага відаць дзьве прынцыповыя ўстаноўкі: 1) на мовазнаўчым фронце змагаюцца толькі дзьве сілы, 2) яфэтычная тэорыя гэта ёсьць сапраўдная марксысцкая лінгвістыка. Але чытач нават ужо з наступнага артыкулу тав. Бочачэра (дырэктар навукова-дасьледчага Інстытуту Мовазнаўства пры НКА РСФСР) можа даведацца аб тым, што «асобныя руплівыя прыхільнікі Мара, каторыя зьяўляюцца больш марыстамі чым сам Мар, хочуць прадставіць яфэтычную тэорыю на сёньняшні дзень як закончаны марксызм, або прынамсі як «марксызм у станаўленьні», што разумеецца няправільна».

З гэтай ўстаноўкай тав. Бочачэра ў адносінах да яфэтыдолёгіі згаджаюцца аўтары данай рэцэнзіі, бо сапраўды яфэтыдолёгію нельга лічыць марксыцка-ленінскай лінгвістыкай, як гэта робіць праф. Баркоўскі.

Бясспрэчна, яфэтыдолёгія тэорыя матар'ялістычная, яна змагаецца з ідэалізмам і імпэрыялістычнымі тэндэнцыямі буржуазнай інда-эўропэістыкі, аднак яна мае рад мэханістычных установак. Грунтуючыся на палеанталёгічным мэтодзе і ігнаруючы ў сувязі з гэтым актуальныя праблемы сучаснасьці, ставячы моватворчы процэс у беспасрэдную сувязь з базай, выводзячы ўсе моўныя факты з мэханістычнай комбінацыі чатырох першаэлемэнтаў, выяўляючы ў сваіх досьледах не-марксыцкае разуменьне сутнасьці клясаў і г. д., яфэтыдалёгія і не магла таму зрабіцца сапраўдным дыялектычна-матар'ялістычным, а значыцца і марксысцка-ленінскім вучэньнем аб мове.

Марксысцка-ленінскае мовазнаўства, якое возьме ў свой жалезны інвэнтар шмат чаго з яфэтыдолёгіі, перамогшы яе мэханіцызм (і нават з інда-эўропэістыкі, перамогшы яе ідэалізм і формалізм), ствараецца на аснове вучэньня Маркса, Энгельса, Леніна і іншых клясыкаў марксызму.

Такім чынам расстаноўка сіл на мовазнаўчым фронце не такая, як яе малюе праф. Баркоўскі. Апрача інда-эўропэістыкі і яфэтыдалёгіі, ёсьць сапраўдная марксысцка-ленінская лінгвістыка, якая змагаецца і будзе змагацца на два фронты—як з рэакцыйнай інда-эўропэістыкай, так і з мэханістычнай яфэтыдалёгіяй.

І таму цалкам зразумела, што выступленьне групы савецкіх лінгвістаў пад назвай «Языкаведны фронт», якая была ініцыятарам лінгвістычнай дыскусіі і ў сваёй дэклярацыі заклікала да стварэньня сапраўднай марксысцка-ленінскай лінгвістыкі, паставіла ў тупік праф. Баркоўскага; ён фактычна ня можа даць рады і не адважваецца даць належны разгорны аналіз пляцформе «языкофронтовцев», ён абмяжоўваецца ў адносінах іх толькі заўвагай аб тым, што іх выступленьне «згуляла (Sic! аб мове артыкулу гутарка будзе пазьней) на руку інда-эўропэістам».

Самакрытыкі (як спачатку назвалі гэтую дыскусію) праф. Баркоўскі вельмі баіцца; ён міласьліва згадзіўся-б дапусьціць толькі крытыку «сяброўскага характару», але што ён разумее пад крытыкай «сяброўскага характару» ў такіх важных пытаньнях як мэтадалёгія, яму аднаму вядома. У такіх важных пытаньнях павінна весьціся непрымірымая барацьба з усялякімі адхіленьнямі ад марксысцка-ленінскай лініі, ня можа быць літасьці ні да памылак «сяброў», ні да сваіх уласных памылак, і таму мы абавязаны ня ў меншай меры крытыкаваць памылкі і пасобных языкафронтаўцаў—у тав. Данілава вялікадзяржаўніцтва, у якім ён сам прызнаецца, лёгізм у тт. Ламцёва і Дабравольскага і г. д.

Гэты страх перад самакрытыкай праф. Баркоўскага, і да рэчы сказаць, страх сапраўдных афіцыйных марыстаў перад крытыкай, які цалкам нагадвае страх і аргумэнтацыі дэборынцаў ў філёзофскай дыскусіі, мала агульнага мае з адносінамі самога акадэміка Мара да самакрытыкі, аб чым чытач можа даведацца з таго-ж самага артыкулу тав. Бочачэра. Спасылаючыся на словы Мара, тав. Бочачэр кажа, што «сам Мар прадбачыць крытыку ўласнай тэорыі і кліча ў лінгвістыку сапраўдных марксыстаў, якія павінны пераацэньваць усе каштоўнасьці і крытыкаваць тыя ісьціны, што ўжо зрабіліся канонамі». Прынам сі так раней пісаў акадэмік Мар.

Прызнаючы яфэтыдалёгію сапраўдным марксысцка-ленінскім мовазнаўствам, тав. Баркоўскі адначасова робіць памылкі і ў вырашэньні пытаньня аб інда-эўропэістыцы. Выяўляючы сваю «архірэволюцыйнасьць» поўным выкідваньнем за борт усёй спадчыны інда-эўропэістыкі, чаго ня робяць ні сам акад. Мар (гл. яго артыкул у зборніку «Языковедение и материализм» 1929 г.), ні языкафронтаўцы (гл. рад артыкулаў аб дыскусіі ў № 1 часопісу «Революция и язык» 1931 г.), праф. Баркоўскі ў той самы час не разгарнуў шырока крытыкі інда-эўропэістыкі, не падкрэсьліў самых шкодных яе установак.

Так напрыклад, ён не дае крытыкі псыхолёгізму, як адной з рознавіднасьцяй ідэалізму, не крытыкуе мэтафізычнасьці фармальнай граматыкі і г. д. Гэта ўсё відаць не выпадкова ў праф. Баркоўскага, бо ў яго падручніку па агульным мовазнаўстве, які зараз знаходзіцца на рэцэнзіі ў Інстытуце Мовазнаўства БАН, адпаведныя месцы аб яфэтыдалёгіі сшыты белымі ніткамі з разьдзеламі аб фанэтыцы, граматыцы і г. д., пабудаванымі на прынцыпах старой буржуазнай лінгвістыкі з яе фармалізмам і г. д.

Такім чынам, нібы змагаючыся з інда-эўрапэістыкай, праф. Баркоўскі больш б'е па аглоблях, чымся на кані.

Адно правільна сказаў у рэцэнзуемым намі артыкуле праф. Баркоўскі, што «мы часта залішне сьпяшаемся, калі залічаем таго або іншага дасьледчыка ў лік сапраўдных вучоных марксыстаў».

Ці не пасьпяшыўся і праф. Баркоўскі, залічыўшы марыстаў у лік сапраўдных марксыстаў-лінгвістаў, а таксама залічыўшы сябе ў лік марыстаў, а значыцца, па яго думцы, у лік «вучоных марксыстаў»?

Нам здаецца, што праф. Баркоўскі пасьпяшыўся.

Ня менш зьдзівіць чытача і мова гэтых абодвых артыкулаў. Вось некалькі «пэрлаў»: «Даклады згулялі на руку інда-эўропэістам» (ст. 167 і 172); схэма уяўляе асноўны інтарэс (ст. 153; выбачайце, схэма нічога ня можа ўяўляць!); яфэтычная тэорыя, пройдучы этап «стыхійнага матэрыялізму» (ст. 172); яна не абмеркавала асабістасьці (Sic! асаблівасьці мабыць?) палажэньня (ст. 174); як і праф. Паліванавым, праф. Пэтэрсонам, праблем, маючых інтарэс і над якімі працавалі ў працягу 1917-1927 гг., высоўваецца ня вельмі многа (разумей як хочаш!) (ст. 146); ці належыць пасьля гэтага дзівіцца з таго, што і залежныя (?) інда-эўрапэісты выступалі... (ст. 147); (на працягу ўсяго артыкулу замест сэмітычныя) схэмітычныя; разгарнеце абыякую дапамогу па мове для сярэдняй школы, адвярнеце старыя кнігі... (ст. 148); «група «мовазнаўчы фронт» пакутуе на некаторыя лібэральныя адносіны да «савецкіх» інда-эўропэістаў» (ст. 175) і г. д., і г. д.

Сапраўды, мова «Полымя» «пакутуе» на безграматнасьць і неахайнасьць, а чытач удвая пакутуе ад такой мовы часопісу «Полымя».

Пазыку „Трэці рашаючы“—у масы

Краіне патрэбны сродкі

Аднаасобны сэктар вёскі цягнецца ў хвасьце па рэалізацыі пазыкі. Неадкладна аформіць падпіску, забясьпечыць своячасовае паступленьне ўзносаў

Калгас „Новы быт“, які выканаў 146 проц. пляну рэалізацыі пазыкі—лепшы прыклад для ўсіх калгасаў БССР

Калгас «Новы быт», Лоеўскага раёну, першым у Бывалькоўскім сельсавеце выканаў з перавышэньнем заданьне па распаўсюджваньні пазыкі «Трэцяга рашаючага». Замест 600 руб. вызначаных паводле заданьня, калгас нікі калгасу «Новы быт» падпісаліся на 875 руб., што складае 146 проц. заданьня. Падпіскай ахоплены ўсе 100 проц. калгасьнікаў. У сярэднім кожны калгасьнік падпісаўся на 25 р.

Найбольш актыўны ўдзел у гэтай рабоце трымаў вылучэнец Украіны, старшыня калгасу «Новы быт», тав. **Сямірэнка Янка**, якога за ўдарную работу, трэба занесьці на чырвоную дошку.

Усе калгасы Лоеўскага раёну і БССР павінны пайсьці па ўзорным прыкладзе калгасу «Новы быт».

С. Лількевіч.

Падпісаліся больш як на 100 проц.

Рэалізацыя пазыкі «Трэці рашаючы» у прыгараднай гаспадарцы Слуцкага райсаюзу прайшла з вялікім посьпехам. Заданьне выканана больш як на 100 проц.

Трэба адзначыць, што гэтая пасьпяховая работа праведзена дзякуючы ініцыятыве рабочых, якія шырока разгарнулі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Рабочыя прыгараднай гаспадаркі выклікаюць на сацспаборніцтва іншыя калгасы Слуцкага раёну.

Алесь Шпакоўскі.

Камсод афармляе падпіску на пазыку.

Выклік прымаю і выклікаю

Выклік селькора Яроменкі Міколы, зьмешчаны ў газэце «Савецкая Беларусь» за 15-VIII—31 г. аб падпісцы на пазыку «3-га рашаючага» прымаю. Я асабіста падпісаўся на пазыку на 155 проц. месячнай зарплаты, акрамя таго бяру на сябе абавязак поўнасьцю распаўсюдзіць пазыку сярод сялян аднаасобнікаў. Выклікаю на сацспаборніцтва рабселькораў «Савецкай Беларусі» Шумілава Р. (Шклоўскі р.), Гур Р. (Полацкі р.), Дамброўскага А. (Бабруйск), Клімовіча Я. (Рагачэў) і ўсіх селькораў «Савецкай Беларусі».

Брыгадзір газ. «Сав. Бел.»

Я. Савіцкі.

Вёскі Гомельшчыны плятуцца ў хвасьце

ГОМЕЛЬ. (Ад нашага кар.). Гомельскі раён у справе рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы» значна адстае. Калі калгасны сэктар набліжаецца да выкананьня свайго заданьня, то па аднаасобным сэктары маецца толькі—20 проц. выкананьня. Упарадзе плуць калгасы Ўлукаўскага сельсавету. Ужо скончылі сваё заданьне Карналінскі сельсавет, які мае 186 проц. выкананьня, Давыдаўскі і Прыбарскі. Плятуцца ў хвасьце—Міхалькаўскі, Яроменскі, Жгуня-Будзкі, Жгунскі і Касьцюкоўскі сельсаветы.

Прэзыдыум Гарпрафсавету прымаваў для дапамогі і правядзеньня падпіскі да ўсіх сельсаветаў прадпрыемствы, якія перавыканалі сваё заданьні па падпісцы ў горадзе. Дзякуючы гэтаму мерапрыемству ўжо ёсьць некаторы зрух, напрыклад: завод імя Ланцуцкага паслаў рабочую брыгаду ў Касьцюкоўскі сельсавет, якая за адзін дзень дзякуючы энэргічнай рабоце дабілася павышэньня выкананьня заданьня з 13 проц. да 43 проц.

Яў. Р.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР	Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева **Кірмаш нявест**. Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.
Дзярж-ЦЫРК	Поўная пераменa праграмы. Гастролі ўпершыню прыбыўшых артыстых. Заслужоныя артысты ССРГ. Бр. ТАНЦІ музычныя сатырыкі. Лепшыя ў СССР атракцыёны, міравыя рэкорды плаваньня ў паветры 6 Эльворці 6. Вышэйшае дасягненьне эквілібрыстыкі 2 Голядзе 2. Новая групавая дрэсыроўка коняй А. В. Лапіяда. Выезд нэгрыцянскіх наезьнікаў жакеў 4 Кук 4. Музычныя інструмэнталісты Вероніка. Выезд наезьніка Пэрвіль. Спарт. акрабаты Веомаш. Пачатак а 9 гадз. Льготныя білеты ў рабочай касе. Па заяўкам ФЗМК скідка 40 проц.
Кіно-тэатр Культура	Новы мастацкі бытавы фільм **2 МАТКІ 2** у галоўнай ролі Цэсарская
Кіно „Інтэрнацыянал“	З 23-га жніўня **Паўночнае каханьне** Звыш праграмы часожніўня піо Бел. Дз. Кіно № 14. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.
Кіно „Пралетары“	Мастацкі фільм па нашум. раману **ПРАКАЖЭНАЯ** Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 10-30 г.
„Чырвоная Зорка“	З 26-га жніўня Гарольд Лейд у новай амэрык. камэдыі „Шпаркасьць і націск“ звыш прагр. „Трымай зладзея“ Цаны паніжаны.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх дэпутатаў

„Пра рамонт стрэх і вадасточных труб“

25 жніўня 1931 № 27 гор. Менск

Менскі Гарадзкі Савет ПАСТАНАЎЛЯЕ

1. Абавязаць усе домаўладаньні гор. Менску (дзяржаўныя, камунальныя, кааперацыйныя, прыватныя і іншыя) неадкладна прыступіць і да 20 верасьня 1931 г. закончыць рамонт стрэх і вадасточных труб.

2. Вінаватыя ў невыкананьні гэтай пастановы прыцягваюцца да адказнасьці ў адміністрацыйным парадку: штрафу да 100 руб., альбо прымусовых работ да 15 дзён.

3. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскладаецца на міліцыю.

4. Гэта пастанова ўступае ў сілу праз 5 дзён з часу абвяшчэньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету **ВАЛОДЗЬКА**

Сакратар Гарсавету **ШАЛКАВЕЦ**

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

ВЫШАЎ З ДРУКУ ЗА ЛІПЕНЬ МЕСЯЦ

Масавая палітычная літаратура

Сталін—Новая абстаноўка, новыя задачы гаспадарчага будаўніцтва, тыраж 20000, цана 03 кап.
Сорын—У. І. Ленін, 1870—1924 г.г., тыраж 10000, цана 30 кап.
Мануільскі—Тэльман і Кашэн. XI пленум Выканкому Камуністычнага Інтэрнацыяналу, тыр. 5000, цана 30 кап.
Матыляў—Дзьве сыстэмы, два вынікі, дзьве пэрспэктывы, тыр. 5000, цана 15 кап.
Вэйсман—Чаму не хапае тавараў, тыраж 7000, цана 05 кап.
Да новых бояў (рэзолюцыі і пастановы V канграсу Прафінтэрну), тыр. 4000, цана 1 руб.
Снадзкі—Інтэрвэнцыя, тыр. 3000, цана 40 кап.
Рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б) 11—15 чэрвеня, тыр. 1500, цана 03 к.
Карасьцялёў—Забясьпечым краіну гароднінай, тыр. 15000, цана 12 к.
Дзітрых—Сусьветнае беспрацоўе, тыраж, 12000, цана 09 кап.
Галадзед—Барацьба за індустр. і калектывіз. БССР, тыр. 10000, цана 30 кап.
Задачы бальшавіцкага друку, тыр. 5000, цана 20 кап.
Ёзэф—Рэволюцыйны ўздым у Вэнгрыі, тыр. 7000, цана 20 кап.
Андрэў—Са спажыючай у выворчую, тыр. 7000, цана 15 кап.
Праграма гутарак з леннаборам, тыраж 2000, цана 05 кап.
Гураў—Дарвінізм і атэізм, тыр. 5000, цана 75 кап.
Ракоў—Шляхі рацыяналізацыі дзяржапарату, тыр. 3000, цана 85 кап.
Гаёк—Жыцьцё і барацьба чэхаславацкіх рабочых, тыр. 3000, цана 10 к.
Кержанцаў і Леонцеў—Азбука ленінізму, вып. III, тыр. 10000, ц 40 к.
Жалязноў—Брыгада на гаспадарчым разьліку, тыр. 5000, цана 10 кап.
Міжнародны Чырвоны дзень (матар. для дакладч.), тыр. 6000, цана 07 кап.
Гэры х Лаўэр—За 17000000 тон чыгуну, тыр. 8000, цана 10 кап.
Горкі—Адказ інтэлігенту, тыр. 7000, цана 05 кап.
Аб маскоўскай гарадзкой гаспадарцы і аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі СССР, тыр. 10000, ц. 05 к.

Законадаўствы аб працы.

Кодэкс аб працы, тыраж 10000, цана 25 кап.
Працоўнае законадаўства БССР і СССР тыр. 3000, цана 6 р. 25 кап. у перапл.
Правілы ўнутранага распарадку і табель спагнаньняў, тыр. 30000, цана 10 кап.

Літаратура вайсковая, тэхнічная і для ячэек ТДА-Авіяхіму.

Ардынскі—Аддзяленьне ручнога кулямёта ў баі, тыр. 3000, ц. 30 к.
Монігец—Як ваюць з газамі, тыраж 8000, цана 10 кап.
Максіменка—Барацьба з авіяцыяй, тыраж 5000, цана 50 кап.
Баявы статут пяхоты РСЧА, ч. І, тыр. 3000, цана 80 кап. у перапл.
Настаўленьне артылерыі РСЧА, тыраж 2000, цана 75 кап.
Настаўленьне па службе варт. паветранай службы, тыр. 2000, цана 80 кап.
Краханёў—Агульны догляд за варштатамі, тыр. 3000, цана 20 кап.
Збор палажэньняў для нізавых арганізацый ТДА-Авіяхіму, тыр. 8500, цана 15 кап.
Палажэньне аб саветах ТДА-Авіяхіму на буйных прадпрыемствах, тыраж 8000, цана 10 кап.

Мастацкая літаратура

А. Александрозіч—Цені на сонцы (другое выд.), тыр. 3000, цана 55 к.
Блісьцінаў—Агні Палесься, тыр. 2000, цана 80 кап.
Вэйсман—Права на ордэн, тыр. 6000, цана 12 кап.
Гор—Скрозь агарожу штыкоў, тыраж 8000, цана 20 кап.
Гашэк—Прыгоды ўдалага ваякі Швэйка, ч. І, тыр. 5000, цана 1 р. 10 к у перапл.
Гашэк—Прыгоды ўдалага ваякі Швэйка, ч. II, тыр. 5000, цана 1 р. 15 к.
М. Зарэцкі—Сьцежкі дарожкі (др. г. выд.), тыр. 3000, цана 3 руб.
Кірыленка—Адна эпоха, тыр. 5000, цана 35 кап.
Леонаў—Сталіца народу аванькі, тыр. 5000, цана 30 кап.
Лявоны—Жалезныя віхуры, тыр. 2000, цана 70 кап.
Юры Алёша—Зайздрасьць, тыр. 5000, цана 60 кап.
Агнёў—Дзёньнік Косьціка Рабцава, тыр. 5000, цана 90 кап.
Паліванак—Удовіна арцель, тыр. 5000, цана 80 кап.
Тарпан—У тумане, тыр. 5000, цана 10 кап.
Пад'ячэў—Пакуты, тыр. 3000, цана 1 р. 35 кап.
Сьмірноў—Тайга шуміць, тыр. 3000, цана 35 кап.
Чорны—Вясна, тыр. 5000. цана 45 кап.

Сельская гаспадарка і калектывізацыя

Нісьневіч — Арганізавана правядзем другую бальшавіцкую ўборачную кампанію, тыр. 15000, цана 10 кап.
Комсамол і калгасная моладзь за ахову ўраджаю, тыр. 25000, цана 01 кап.
Улік у калгасах, тыр. 25000, цана 20 кап.
Пастанова НКЗБ і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасе, тыр. 100000, цана 02 кап.
Розэнблюм—Арганізацыя сіласаваньня ў калгасах, тыр. 7000, ц. 15 к.
Камсамол за аўладаньне агратэхнікай, тыр. 5000, цана 32 кап.
Круглоў—Работа пастуха-жывёлавода ў саўгасах і калгасах, тыр. 5000, цана 25 кап.
Плятнэр—Зьдзельшчына ў калгасах, тыр. 15000, цана 17 к.
Наумаў—Гадоўля і выкармліваньне цялят, тыр. 10000, цана 15 кап.
Маскалёў—Малочная гаспадарка ў спажываючай паласе, тыр. 10000, цана 05 к.
Лебедзевіч—Культурная пашча на асушаных балотах, тыр. 15000, цана 25 кап.
Мархавец—Хатнія паразіты, грызуны і барацьба з імі, тыр. 5000, цана 10 кап.
Клашчэўнікаў—Зялёнае ўгнаеньне, тыр. 10000, цана 10 кап.
Арлоўскі—Арганізацыя груп. кармленьня кароў, тыр. 10000, цана 12 кап.

Дзіцячая і навукова-папулярная літаратура

Шынклер — Ічэ тыр. 12000, цана 15 кап.
Пілюга—Савецкая дэлегацыя 2-га міжнароднага піянэрскага зьлёту, тыраж 5000, цана 10 кап.
Вейкаў—Дзеці змаганьня, тыр. 7000, цана 10 кап.
Ільін—Сто тысяч чаму, тыр. 7000, цана 10 кап.
Лясны—Расьліны чужаеды, тыр 5000, цана 35 кап.
Казачэнка—Спадарожнік юнага майстра, тыр. 7000, цана 15 кап.
Лявонцаў—Зрабі сам, тыр. 5000, тыраж, 5000, цана 30 кап.
Алешчынскі—Як разьвівалася машынная тэхніка, тыр. 5000, цана 25 к.

Мэдычная і сан-асьветная літаратура

Альшванг—Як выгадаваць грудное дзіця, тыр. 7000, цана 12 кап.
праф. Бурак—Вольнае насавое дыханьне і здароўе, тыр. 7000, цана 15 кап.
Яго-ж—Гігіена голасу, тыр. 3000, цана 25 кап.
Яго-ж—Першая дапамога ў няшчасных выпадках у галіне вуха, носа і горла, тыр. 5000, цана 15 к.
Яго-ж—Склерозн. захворв. дыхац. шлях., тыр. 3000, цана 35 кап.
Дворжыц—Хваробы вачэй у сельскім быце, тыр. 3000, цана 20 кап.
праф. Корчыц—Антысэптыка і асэптыка, тыр. 3000 цана 65 кап.
Яго-ж—Агульны наркоз, тыр. 3000, цана 60 кап.
Сарнізаў—Ці лечыць фізычная культура, тыр. 3000, цана 05 кап.

Падручнікі і дапаможнікі для школ

Мяшалкін—і інш. Будзь гатоў (лемантар), тыр. 100000, цана 40 кап.
Пігулеўскі—Дзецям калгасу (чытанка для І гр. ШКМ), тыр. 25000, цана 37 кап.
Пруднік і інш.—Наша мова (Граматыка для II гр.), тыр. 90000, цана 20 кап.
Праграма і мэтадычныя запіскі па музычным выхаваньні, маляваньні і фізвыху, тыр. 3000, цана 35 кап.
Праграма і мэтадычныя запіскі па беларускай мове і літаратуры, рас. і ням. мовах, тыр. 3000, цана 45 кап.
Дэталізаваная праграма для I-II гр. 4-х і 7-годак вясковы адмен. тыраж 16000, цана 30 кап.
Дэталізаваная праграма для III і IV гр., 4-х і 7-годак, тыр. 17000, цана 35 кап.
Некрасаў—Азбука каморніцкае справы (для ШКМ), тыр. 3000 цана 1 р. 60 кап.
Струкоўскі і Сілін—Аб мэтрычнай сыстэме мер, тыр. 5000, ц. 07 кап.
Траймовіч—Гідротэхніка рыбнае справы, тыр. 3000, цана 2 руб.

Часопісі

Ленінская вучоба для КСМ № 1, тыраж 5000, цана 20 кап.
Ленінская вучоба для КСМ № 2, тыраж 5000 цана 20 кап.
Ленінская вучоба для КП(б)Б № 6, тыр. 10000, цана 15 кап.
Ленінская вучоба для КП(б)Б № 7, тыр. 10000 цана 20 кап.
Завочны комвуз № 6, тыр. 1500, цана 1 руб.
Камуністычнае выхаваньне № 5, тыр. 65000 цана 80 кап.
Маладняк № 5, тыр. 3000, цана 50 к.
Узвышша № 5, тыр. 15000, цана 80к.
Полымя № 4, тыр. 2000, цана 1 руб.

СЭКТАР КНІГА РАСПАЎ СЮДЖВАНЬНЯ

Продаж утвараецца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, спажыўкаапэрацыі і саюздруку.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Глаўлітбел № 598

Друкарня імя СТАЛІНА